№ 3 (553) 24 студзеня 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

# А ўсё-ткі яны выходзяць

Каля дзьвюх тысяч дэманстрантаў узялі ўдзел у новай акцыі пратэсту супраць эканамічнай палітыкі ўладаў у цэнтры сталіцы. Разгонам камандаваў асабіста міністар унутраных справаў **Уладзімер Навумаў**. Старонка 6.

## У НУМАРЫ

**У Менску зьнясуць гатэль «Беларусь»**

Адначасова сусьветныя сеткі «Кемпінскі» і «Хаят» прыходзяць у Беларусь. **Старонка 16.**

**Даляр расьце, нафта падае**

Абвал на фондавых рынках, зьмена эканамічных тэндэнцый у сьвеце. **Старонка 12.**

**Дарашкевіч пра Аляхно**

Фотарэпартаж з адборышча на «Эўрабачаньне». **Старонка 28.**



Юлія Дарашкевіч

**Два палітвязьні раптоўна выйшлі на свабоду на мінулым тыдні. Зьміцер Дашкевіч (на фота): «Мне сказалі: «Каб сёньня ж цябе ў калёніі не было». Старонка 3. Мікалай Аўтуховіч: «Раней я адзін змагаўсяза свае правы, цяпер такіх шмат». Старонка 13.**

# Нашаніўцы ў Менску, Маладэчне, Верхнядзьвінску, Гарадку і Віцебску

**24 студзеня ў Берасьці** пройдзе прэзэнтацыя кнігі філёзафа Пётры Рудкоўскага «Паўстаньне Беларусі». Удзел у ёй бярэ і пісьменьніца Наталка Бабіна. Даведкі праз т.: (029) 626-08-49 (Сяргей).

**26 студзеня ў Маладэчне (вул. Чыстая, 26)** пройдзе падвойная прэзэнтацыя — Валер Булгакаў і гісторыкі Алесь Пашкевіч і Андрэй Вашкевіч прэзэнтуюць гістарычную публікацыю «Кароткі нарыс беларускага пытаньня», а пісьменьнік Уладзімер Арлоў — сваю новую кнігу «Імёны Свабоды». Пачатак **а 16.00.**

**30 студзеня ў Менску на Ўправе БНФ (вул.Варвашэні, 8)** пройдзе прэзэнтацыя раману Артура Клінава «Малая падарожная кніжка па Гораду Сонца». **Пачатак у 18.00.**

**9 лютага** рэдактар часопісу ARCHE і Наталка Бабіна наведаюць **Верхнядзьвінск**. Пачатак сустрэчы **ў 11.00**, даведкі па т.: (029) 518-74-19 (Валянціна). У той самы дзень пройдуць сустрэчы **ў Гарадку** (пачатак **а 15-й**, даведкі па т.: (029) 672-38-42 (Леанід) і **ў Віцебску** (пачатак **а 19-й**, даведкі па т. (029) 323-98-46 (Віталь). У Гарадку і Віцебску да Булгакава і Бабінай далучыцца Ўладзімер Арлоў.

# ...І Мухамэд — прарок яго

Аляксандар Зьдзьвіжкоў атрымаў тры гады турмы за «распальваньне рэлігійнай варожасьці». Дакладней — за передрук карыкатураў. Што прадэманстравала нам улада на прыкладзе справы журналіста? Піша **Віталь Тарас**.

Аляксандар Зьдзьвіжкоў атрымаў тры гады калёніі ўзмоцненага рэжыму за «распальваньне рэлігійнай варожасьці». Дакладней — за передрук карыкатураў дацкага мастака ў газэце «Згода», дзе Зьдзьвіжкоў быў намесьнікам галоўнага рэдактара. Гэта быў люты 2006 году… Што прадэманстравала нам улада на прыкладзе справы журналіста?

Па-першае, яна паказала сваю надзвычайную жорсткасьць і помсьлівасьць.

Зьдзвіжкова ўзялі ў той момант, калі ён прыехаў у Беларусь наведаць магілу бацькі — як у кепскіх дэтэктывах пра шпіёнаў і тэрарыстаў. Гэта адбылося праз год і дзевяць месяцаў пасьля ўзбуджэньня крымінальнай справы (!). І кінулі журналіста не ў абы якую турму, але ў славутую «амэрыканку», турму КДБ у Менску. Яго судзілі за зачыненымі дзьвярыма, як сапраўднага дзяржаўнага злачынцу. А дзяржаўны вінаваўца патрабаваў даць яму чатыры гады зьняволеньня.

Па-другое, улада зноў прадэманстравала ўсяму сьвету, што эўрапейскія каштоўнасьці для яе — пусты гук. У тым ліку, свабода слова і свабода сумленьня.

Публікацыя карыкатураў у дацкай газэце Jyllands-Posten выклікала, як вядома, масавыя акцыі пратэсту мусульманаў-фанатыкаў ва ўсім сьвеце. (Дарэчы, апублікаваныя яны былі ў 2005 годзе, але рэакцыя ўсчалася, калі карыкатуры перадрукавалі іншыя газэты — у тым ліку, у Нарвэгіі і Францыі.)

Самая вядомая сярод карыкутараў — выява барадатага чалавека ў чалме, у якой прыхаваная бомба з падпаленым шнурам. Лёгка зразумець, што гэта карыкатура ня столькі на прарока Мухамэда (хоць так была пазначаная сэрыя малюнкаў), колькі на ісламскіх экстрэмістаў і шахідаў, якія зьдзяйсьняюць жудасныя злачынствы ад імя прарока.

Але ў мусульманскім сьвеце не зразумелі «гумару». Акцыі пратэсту ў самых розных краінах працягваліся некалькі месяцаў. Удзельнікі гэтых акцыяў палілі дзяржаўныя сьцягі Даніі, Нарвэгіі і, чамусьці, ЗША. У сталіцы Інданэзіі Джакарце натоўп фанатыкаў спрабаваў захапіць дацкае пасольства. Бясчынствы натоўпу ў розных краінах суправаджаліся пагромамі, у якіх загінулі дзясяткі чалавек. Дзясяткі журналістаў атрымлівалі пагрозы на свой адрас, калі толькі яны спрабавалі выказацца ў падтрымку калегаў з Даніі.

Заходнія журналісты таксама праводзілі свае акцыі пратэсту — толькі ў больш цывілізаваным выглядзе. Журналісцкая салідарнасьць выказвалася, найперш, праз передрук дацкіх карыкатураў.

Наколькі мудрым было рашэньне апублікаваць іх у газэце «Згода» ў той палітычнай сытуацыі, якая тады склалася ў Беларусі — гэта ўжо іншае пытаньне. Яна ня мае дачыненьня да свабоды словы.

Але ясна, што расплата за памылку журналіста — залішне жорсткая. Тым больш, што мусульмане Беларусі не выходзілі з акцыямі пратэсту. Больш за тое, іх прадстаўнікі выказвалі зьдзіўленьне наконт працэсу.

Вынікі яго могуць прынесьці задавальненьне хіба што Ахмадзінэджаду. А таксама «Хамасу», «Хэзбалаху», Брыгадам пакутнікаў Аль-Аксы, Ісласмскаму джыхаду — колькі іх там яшчэ, розных экстрэмісцкіх арганізацыяў? Няўжо ўлада ў Беларусі не заўважае, што сьвядома або міжволі яна аб’ектыўна апынулася на іхным баку?

Але яшчэ большае неўразуменьне выклікае маўчаньне многіх калегаў Зьдзвіжкова. Беларуская асацыяцыя журналістаў рабіла ўсё магчымае, каб хоць бы зьмякчыць прысуд былому намесьніку рэдактара. А якая рэакцыя калегаў зь іншых СМІ? Ці прычакаем рэакцыі палітычных партыяў і рухаў, праваабарончых арганізацыяў на тое, як чалавека прыносяць у ахвяру інтарэсам дзяржавы, папіраючы правы чалавека?

Ці ў нас дамінуе лёзунг: «кожны памірае ў адзіноце»?

# Адным росчыркам пяра

Тыдзень быў адзначаны вызваленьнем двух палітвязьняў. Сьледам за Мікалаем Аўтуховічам на свабоду раптоўна выйшаў Зьміцер Дашкевіч.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Яго вызвалілі з шклоўскай калёніі, дзе ён адбываў пакараньне. Паводле словаў Зьмітра, навіна пра вызваленьне для яго была поўнай нечаканасьцю. Нагадаем, што ў лістападзе 2006 г. (ад верасьня 2006 г. ён знаходзіўся ў сьледчым ізалятары) Дашкевіч быў асуджаны на паўтара году зьняволеньня за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт». На волю ён меўся выйсьці 15 сакавіка 2008 г. «У сераду каля 17-й міцыянты прыйшлі на працу і адвялі мяне ў штаб, — распавядае Дашкевіч. — Там мне паведамілі, што рашэньнем Вярхоўнага Суду ад 22 студзеня мой тэрмін зьняволеньня быў зьменшаны да году». Хоць з хадайніцтвам у ВС Зьміцер не зьвяртаўся. Не сьвяціла яму і ўмоўна-датэрміновае вызваленьне — зь пяцьцю «парушэньнямі рэжыму». Высьветлілася ўрэшце, што Дашкевіч пераседзеў у калёніі лішнія чатыры месяцы. «У адказ на пытаньне, як жа з гэтымі месяцамі быць, мне параілі хутчэй сабрацца, і каб сёньня ж мяне ў калёніі не было».

З Шклова Зьміцер скіраваўся ў Воршу, адкуль найзручнейшы шлях у Менск. Дашкевіч не выглядае змучаным — ён праменіцца радасьцю, увесь час жартуе. Перад выхадам на волю яму выплацілі заробленыя на лягернай пілараме рублі. На іх ён накупляў гарбаты і частаваў на аршанскім вакзале ўсіх, хто прыехаў яго сустрэць — Барыса Гарэцкага з «МФ», сяброў-пратэстантаў, журналістаў.

Поўнай нечаканкай было вызваленьне сына і для бацькоў. Як расказаў Вячаслаў Дашкевіч, дзесяць дзён таму яны адправілі сыну бандэроль, але пазаўчора яе вярнулі безь ніякіх тлумачэньняў. Бацькі ўспрынялі гэта як нейкія бюракратычныя перашкоды, а ня сьведчаньне хуткага вызваленьня. «Калі мы ездзілі да сына ў калёнію, ён прынёс нам дзьве вялікія торбы ягонай турэмнай перапіскі. Але ён ня думаў, што выйдзе на волю, ён чакаў чагосьці горшага. Зьміцер быў упэўнены, што сядзець яшчэ доўга», — кажа бацька.

З Воршы Зьміцер адразу ж уначы скіраваўся ў Менск. Ён зьбіраецца засяродзіцца на палітычнай дзейнасьці, вулічных акцыях Вясны-2008, будзе рабіць спробы зарэгістраваць «Малады фронт». Дашкевіч не шкадуе, што прайшоў праз такое выпрабаваньне: «У камэрах людзі ўсё разумеюць, там ведалі, напрыклад, пра акцыі прадпрымальнікаў, якія адбываліся ў Беларусі, там падтрымліваюць палітычныя зьмены».

Цімох Дранчук, кіраўнік аргкамітэту «Беларускага камітэту ў абарону правоў зьняволеных» бачыць у вызваленьнях пазытыўную тэндэнцыю: «Магчыма, улады зразумелі, што недастаткова ўзяць крэдыт у Расеі, каб захавацца. Вызваленьні Аўтуховіча і Дашкевіча — першы крок на шляху выкананьня 12-ці ўмоваў Эўразьвязу. Нельга сказаць, што тут толькі палітычная гульня, гэта канкрэтныя крокі».

«Абсалютна нечаканае вызваленьне! — згаджаецца праваабаронца Алесь Бяляцкі. — Тым больш на фоне апошніх затрыманьняў і «справы Зьдзьвіжкова». Можна меркаваць, што паўплывала цьвёрдая пазыцыя Эўропы па палітычных вязьнях Беларусі. Магчыма, гэта новая спроба рэжыму залагодзіць Захад і зьняць напружанасьць сытуацыі».

**Зьміцер Панкавец,**
**Яраслаў Сьцешык**

# Паненка NEW

На тле палітычных рэпрэсіяў, што аднавіліся пры канцы мінулага году, неяк сьціхлі размовы пра магчымую «лібэралізацыю» дзейнага рэжыму і пэрспэктываў правядзеньня ў Беларусі рэформаў. Аднак шмат якія тэндэнцыі мінулага году акурат паказвалі на тое, што ў беларускай сыстэме пачынаюцца якасныя зрухі. Піша **Віталь Сіліцкі**.

Можна, канечне, сказаць, што нейкія перамены — гэта нармальны стан любой істоты ці сыстэмы, любога арганізму. І ўсё ж, адна справа — гэта рост валасоў на галаве, і іншая — іх выпадзеньне.

Пра тое, куды кіруецца Беларусь, не заўжды можна меркаваць, зыходзячы з балянсу адкручаных і закручаных гаек, вызваленых ці пасаджаных вязьняў, прынятых і адмененых маразматычных нарматыўных актаў і «ператраханых» чыноўнікаў з канкуруючых груповак. Ва ўмовах закрытага грамадзтва, палітычны дыскурс зьяўляецца адным зь нешматлікіх (разам, бадай што, з чэрчылеўскімі бульдогамі, што вылятаюць з-пад дывана) індыкатараў таго, што насамрэч адбываецца ў краіне. У гэтым пляне апошнія месяцы і нават тыдні вызначыліся вельмі паказальнымі мэтамарфозамі і загагулінамі.

Напрыклад, упершыню за апошнія гады ўлада ня толькі спрабавала навязаць уласную вэрсію «нацыянальнага», якая пры гэтым адмаўляла і дыскрэдытавала беларускі нацыяналізм, але і пачала запазычваць пэўныя элемэнты з апошняга. Тут і афіцыйныя імпрэзы на 25 Сакавіка (хаця гэтая падзея, хутчэй, нагадвала, як хрысьціяне прасоўвалі сваю рэлігію, прымацоўваючы свае сьвяты да паганскага календара), і забаўная спроба КДБ вывесьці гісторыю сваіх спэцслужбаў з часоў Полацкага княства і ВКЛ, і супярэчлівая, але ад гэтага ня менш знакавая сустрэча спадара Праляскоўскага з апальнымі музыкамі і працэс іхнага павароту ў афіцыйную мэдыйную прастору і на канцэртныя пляцоўкі, якія дэ-факта распачаўся. Канечне, гэтыя тэндэнцыі ня значаць, што адбыліся фундамэнтальныя зьмены ў дзяржаўнай ідэалёгіі, на іх тле варта заўважыць і працяг большасьці з антынацыянальных практыкаў уладаў. Аднак упершыню альтэрнатыўны ўладам нацыянальны дыскурс робіцца ня ворагам, якога зьнішчаюць, калі ён не здаецца, а аб'ектам інкарпарацыі. Менавіта гэтая рэканфігурацыя і справакавала столькі дыскусіяў вакол паходу музыкаў да Праляскоўскага — гульцы на апазыцыйным полі сутыкнуліся з пэрспэктывай зьмяншэньня і без таго мізэрнага сымбалічнага і культурнага капіталу, якім яны раней валодалі.

Можна, канечне, аднесьці гэтыя нечаканасьці на пэрыяд няўпэўненасьці ў беларуска-расейскіх стасунках. Але нават пасьля таго, як вуглевадародныя справы, здаецца, залатвіў стабілізацыйны крэдыт і ўнутрыпалітычны курс пачаў вяртацца на кругі свае, сюрпрызы ў стасунках улады з грамадзтвам не перапыняюцца. Словы «мы — нацыя», якімі распачаў навагодні зварот Аляксандар Лукашэнка, дагэтуль падаюцца неймавернымі. Пад такое запэўніваньне кіраўніка дзяржавы ў Беларусі не пачынаўся, бадай, аніводны Новы год, прынамсі, з часоў Станіслава Шушкевіча. І нават тое, што сам панятак нацыі ў мове двух постсавецкіх кіраўнікоў Беларусі можа дыямэтральна розьніцца, нельга не заўважыць, што Лукашэнка пачынае пераглядаць тыя прапагандысцкія моманты, якія складалі аснову ягонай ранейшай афіцыйнай ідэалёгіі.

«Нацыянальнае і інтэрнацыянальнае» ў афіцыйным дыскурсе заўжды выкарыстоўвалася з улікам сучаснага палітычнага моманту. Відавочныя зьмены адбыліся недзе ў пачатку дзесяцігодзьдзя. Калі дагэтуль нарастаньне эканамічных цяжкасьцяў і замежнапалітычнага ціску спрычыняла чарговую інтэграцыйную кампанію беларускіх уладаў на ўсходнім кірунку, то пасьля вядомых гісторыяў з мухамі і катлетамі сытуацыя памянялася — рыторыка незалежнасьці акурат стала выходзіць на авансцэну ў пэрыяд эканамічных цяжкасьцяў і замежнага ціску, рэальнага ці віртуальнага. І калі базавае пасланьне апошняга навагодняга звароту працягвае гэтую тэндэнцыю, то ў іншым можна назіраць цікавыя зьмены.

На працягу амаль дзесяцігодзьдзя Лукашэнка, каб вызначыць свае дачыненьні зь беларускім грамадзтвам, выкарыстоўваў мэтафары кшталту «крыштальны сасуд» або «маленькая дзяўчынка, якую я нясу на руках». Відавочна, менавіта такой няўпэўненай у сабе «маленькай дзяўчынкай» беларуская нацыя і была патрэбная на той момант. Гэтая дзяўчынка нечым нагадвала здань, якая перасьледавала аднаго



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

вядомага генія ў вядомым фільме «Гульні розуму» (герой, нагадаем, даў рады сваёй параноі акурат таму, што заўважыў, што маленькі чалавечак за дзесяць год не падрос). Ды і крытэры адметнасьці, своеасаблівасьці беларусаў былі ў афіцыйнай інтэрпрэтацыі, падчас узмацненьня «незалежніцкіх» настрояў ва ўладных колах, своеасаблівымі. Улада прэзэнтавала Беларусь хіба як найбольш не крануты працэсамі мадэрнізацыі і вэстэрнізацыі аскепак «усходнеславянскага этнасу», які, дзякуючы акурат супраціву культурнай і эканамічнай калянізацыі, нібыта заслужыў статус «маральнага лідэра» на постсавецкай прасторы.

Шмат у чым падобная рыторыка захавалася і да гэтага дня, пра што сьведчаць і прамова ў Катэдральным саборы на праваслаўныя Каляды, і той жа самы навагодні зварот, у якім Лукашэнка кажа пра краіну, якая «выпакутавала сваю незалежнасьць» і «не згаджаецца стаць іх (Захаду) марыянэткай». Нельга, аднак, не заўважыць і істотнага адыходу ад дыскурсу «крыштальнага сасуда». Лукашэнка пачаў казаць пра самадастатковасьць, якая зусім ня зводзіцца да ідэяў чучхеянства. Ён абяцае свабоду прыватнага прадпрымальніцтва і сьцьвярджае, што Беларусь ужо перарасла пэўныя практыкі, якія вызначалі дачыненьні паміж дзяржавай і грамадзтвам у папярэднія часы. Ён ужо не «змагаецца за ўраджай», а спрабуе «працаваць сыстэмна і спакойна». Ён акцэнтуе не змаганьне за паварот да савецкіх стандартаў і паказьнікаў, а ганарыцца тым, што краіна разьвіла шэраг вытворчасьцяў, «пра якія нават ня марылі за савецкія часы». Нарэшце, ён кажа пра тое, што Беларусь стала ня толькі «адзінай, згуртаванай нацыяй», але і нацыяй «энэргічнай, моцнай духам», нагадываючы пры гэтым, што «дзяржава — ня Дзед Мароз, які можа прыносіць падарункі і раздаваць абяцаньні». Тэндэнцыя ўзмацненьня гэтых зусім нетыповых для патэрналісцкай лукашэнкаўскай улады нотак — пра самадастатковасьць, пэрсанальную адказнасьць і прыватную ініцыятыву — назіралася ў рыторыцы як самой першай асобы, так і набліжаных да яе на працягу ўсяго году (час ад часу здавалася, што «Саўбелія» запрасіла Яраслава Раманчука ў якасьці эканамічнага аглядальніка).

Можна казаць пра пэўныя заканамернасьці ва ўзаемасувязі палітычнага курсу, эканамічнай палітыкі і афіцыйнага дыскурсу, якія прасочваюцца праз увесь лукашэнкаўскі пэрыяд. Раньні, «Дажынкавы» лукашызм — гэта пэрыяд вяртаньня ў савецкія часы, самазахаваньня, якое можна было забясьпечыць толькі галечай (што выразілася ў інфляцыйным ажыўленьні эканомікі), якая, у сваю чаргу, магла быць апраўданая толькі культам чаркі і скваркі, і інтэграцыйнымі пацалункамі. «Дажынкі» былі квінтэсэнцыяй гэтага пэрыяду. «Аграгарадковы» лукашызм пачатку 2000-х гадоў — гэта пачатак «чырвона-зялёнага эрзац-нацыяналізму», які быў спрычынены пераходам да культу спажывальніцтва як сродку легітымізацыі ўлады. Неабходным сродкам паўстаньня лукашэнкаўскага спажывецкага грамадзтва была зьмена макраэканамічнай палітыкі (спадар Пракаповіч, дарэчы, — сапраўдны герой свайго часу), а лягічнай культурнай праявай (бо грошы ж зьявіліся) — аўтарытарны глямур паводле вэрсіі сямідзесяціадсоткавых сьпевакоў і вядоўцаў зноў утвораных «нацыянальных» тэлеканалаў. Канечне, кожны новы этап цалкам не перакрэслівае папярэдніх. Таму глямурныя паненкі з собскіх тэлеканалаў ліха танчаць на «Дажынках» і час ад часу дазваляюць сабе крыкнуць «Жыве Беларусь» на афіцыйных імпрэзах. Магчыма, «экакурортны» лукашызм увасобіцца ў яшчэ большай ідэалягічнай блытаніне з ухілам да культу «моцнага прыватніка», а глямурныя паненкі і пані з афіцыйных каналаў будуць часьцей пераапранацца ў строі старадаўніх ліцвінак. Так, ужо ўшчэнт раскрытыкаваны праект «Павлинка New» на АНТ можа стаць своеасаблівым культурным сымбалем экакурортнага лукашызму.

Канечне, палітычная рыторыка і практыка — дзьве розныя рэчы. Прыватныя прадпрымальнікі ўжо, напрыклад, пасьпелі ацаніць тую «свабоду прадпрымальніцтва», якую ім варта чакаць у новым палітычным сэзоне. У адрозьненьне ад мадэрнізацыйных працэсаў, працэсы нацыянальнага разьвіцьця незваротнымі не зьяўляюцца. Аднак відавочна, што ўлада імкнецца знайсьці новыя сродкі самалегітымізацыі і перафарматаваць свае стасункі (даруйце за заезджаны тэрмін) — «сацыяльны кантракт» з грамадзтвам. І нават калі гэтае імкненьне не зусім шчырае, нават зусім няшчырае, нават заяўка пра тое, што далей жыць трэба па-новаму, як мінімум, стымулюе зьмены ў грамадзкай думцы і адкрывае прастору для якасна новых грамадзкіх запатрабаваньняў.

Здаецца, што дзяўчынка нарэшце пачала расьці і дасягнула пераходнага ўзросту. Нядаўняе гарэзьлівае дзіця ператварылася ў шалапутную паненку, якую ўжо так проста не пацягаеш на бацькоўскіх руках і не залагодзіш цукеркамі зь сельпо. Як кажуць у народзе, малыя дзеткі, малыя і бедкі, а на ўтрыманьне паненкі ох як шмат трэба, а тут яшчэ і ў бацькоў перадпэнсійны ўзрост на даляглядзе. Вось і пачаў паненцы бацька нагадваць, што прыйшоў час пераходзіць на свой хлеб. Аднак, тут і бацькам трэба думаць, каб не перабаршчыць з самаўтрыманьнем: самастойная і самадастатковая кабета можа зьмяніць іхны ўласны дом да непазнавальнасьці, а то і наўпрост прывесьці ў дом жаніха, а бацькоў саслаць у дом састарэлых. Пытаньне, зь якога боку прывядзе жаніха нашая шалапутная паненка, таксама застаецца адкрытым...

Магчыма, каб уявіць сабе, што адбываецца і будзе адбывацца ў Беларусі ў бліжэйшы час, варта ўявіць яе нацыяй пераходнага ўзросту. Нацыянальнае і дзяржаўнае самавызначэньне ў сучаснай Беларусі падштурхоўваецца, найперш, аб'ектыўнымі і незваротнымі працэсамі сацыяльнай і эканамічнай мадэрнізацыі. Гэтыя працэсы не паддаюцца апісаньню нейкімі лінеарнымі тэндэнцыямі (таму працэсы «лібэралізацыі» і «адкату» могуць праходзіць адначасова). Прага новых сацыяльных умоваў, новай якасьці жыцьця непазьбежна спрычыняе такія ж канфлікты са старым ладам жыцьця і правіламі гульні, якія ў шалапутнай паненкі выклікае калісьці звыклае патрабаваньне бацькоў быць дома да дзевяці гадзінаў вечару. Канфлікты могуць суправаджацца часовымі перамогамі бакоў («адкатамі» і «лібэралізацыямі»), могуць узьнікаць кампрамісы, аднак, як і калі бацькі пачынаюць нацкаць дзецям пра пераход на свой хлеб, старой патрыярхальнай гармоніі і дамастрою ў сям'і ўжо не дачакаесься. Карацей, вэлкам у пераходны ўзрост!



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Прадпрымальнікі кінулі выклік спэцназу

Каля дзьвюх тысячаў дэманстрантаў узялі ўдзел у акцыі пратэсту ў цэнтры Менску. Разгонам камандаваў асабіста міністар унутраных спраў Уладзімер Навумаў.

Напярэдадні акцыі прадпрымальнікаў 21 студзеня па беларускіх тэлеканалах круцілі нарэзкі зь мінулага мітынгу дробных гандляроў, які прайшоў адзінаццаць дзён таму. Камэнтатары БТ і іншых тэлеканалаў паўтаралі, што апазыцыя выкарыстала прадпрымальнікаў у сваіх мэтах, а затрыманымі пасьля акцыі аказаліся «15—17-ацігадовыя падлеткі». Таксама неаднакроць гаварылася, што паводле факту несанкцыянаванага мітынгу 10 студзеня заведзеныя дзьве крымінальныя справы, па якіх цяпер ідзе сьледзтва.

Усяго ў дні перад акцыяй былі затрыманыя і асуджаныя на суткі больш за 40 чалавек. Зьмітра Хведарука, Франака Вячорку і некатораых іншых моладзевых актывістаў затрымлівалі проста пад будынкам суду, куды яны прыходзілі падтрымаць сваіх паплечнікаў.

Калі такім чынам улады спадзяваліся зьменшыць колькасьць дэманстрантаў, то часткова гэта ўдалося. А 12-й на Кастрычніцкай плошчы знаходзілася ўсяго некалькі соцень чалавек. Асаблівага імпэту яны не выяўлялі. Здавалася, усе чакалі, хто ж возьме на сябе ініцыятыву. Тымчасам з гукаўзмацняльнікаў на плошчы трансьляваліся перадачы Першага каналу беларускага радыё.

Праз арышты лідэраў прадпрымальніцкага руху — Алеся Таўстыкі, Аляксандра Макаева, Анатоля Шумчанкі, Сяргея Парсюкевіча, — не было чалавека, які змог бы павесьці дэманстрантаў за сабой.

Сорак хвілінаў людзі сталі без усялякага дзеяньня. Так было да той пары, пакуль слова ня ўзяў намесьнік старшыні Партыі БНФ Алесь Міхалевіч. Палітык сказаў, што не ягоная справа выступаць на гэтым мітынгу, аднак, калі лідэры руху апынуліся за кратамі, то ён мае права гаварыць ад іхнага імя. Міхалевіч заклікаў улады вызваліць лідэраў прадпрымальнікаў, правесьці перамовы і адмяніць указ № 760, а да прадпрымальнікаў зьвярнуўся з заклікам далучацца да апазыцыйных акцыяў вясной 2008-га. У гэты час над натоўпам зьявіліся бел-чырвона-белыя сьцягі, а таксама штандары незарэгістраваных рухаў «Бунт» і «За свабоду». Пасьля выступу былога палітвязьня Сяргея Скрабца гандляры перайшлі да прыступак Палацу рэспублікі, дзе ўласна і пачаўся мітынг.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Прадпрымальнік з Вузды Віктар Крываль прапанаваў працягнуць забастоўку да канца лютага. Адна з прадпрымальніцаў заклікала патрабаваць, каб выйшаў Лукашэнка. Прысутныя пачалі скандаваць: «Цара!». Праўда, ужо праз пару хвілінаў натоўп дружна гукаў «У адстаўку!», калі Аляксандар Цацура сказаў, што намесьнік міністра эканомікі Андрэй Тур і гарант Канстытуцыі мусяць сысьці са сваіх пасадаў.

Віктар Крываль заклікаў людзей разыходзіцца: «Нас яшчэ недастаткова шмат, каб ісьці да Адміністрацыі. Калі нас будзе 20 тысячаў, то мы зможам дыктаваць свае ўмовы». Ён таксама паведаміў, што прадпрымальнікі падтрымаюць акцыі апазыцыі вясной гэтага году. У гэты самы момант нехта гукнуў: «Пойдзем да Сідорскага». Ідэя атрымала хуткі распаўсюд сярод людзей, і ўжо праз пару хвілінаў калёна ішла праспэктам у бок плошчы Незалежнасьці.

Недалёка ад «Макдоналдзу» людзі выйшлі на праезную частку, ДПСнікі справіцца зь імі не змаглі, таму праз пару хвілінаў пад'ехалі аўтазакі з спэцназам. Ніхто з машынаў не выходзіў, але і іхнага грознага выгляду хапіла, каб людзі зноў зьвярнулі на тратуар. У калёне ішло больш за дзьве тысячы чалавек.

Не пасьпелі ўдзельнікі акцыі падысьці да Дому ўраду, як зьявіўся міністар унутраных справаў Уладзімер Навумаў **(на ніжнім фота ў цэнтры)**. Ён сказаў, што маніфэстанты «спаралізавалі рух па ўсім горадзе», і калі праз дзесяць хвілінаў яны не разыдуцца, будзе ўжытая фізычная сіла. Ілюстрацыяй былі пашыхтаваныя на плошчы спэцназаўцы ў поўным узбраеньні.

Праз пару хвілінаў яны пачалі адцясьняць людзей у бок гатэлю «Менск», грукаючы ў шчыты. Разгонам асабіста камандаваў Навумаў. Некалькі разоў ён паказваў на людзей, якіх трэба затрымліваць. Пасьля гэтага небарак цягнулі і кідалі ў аўтазакі. Спэцназ расьсек натоўп: частку блякаваў на плошчы Незалежнасьці, а другую палову павёў па праспэкце. Недалёка ад будынку Менгарвыканкаму стаялі байцы вайсковай часткі 3214 пад загадам Дзьмітрыя Паўлічэнкі, але іхная дапамога па разгоне мітынгу не спатрэбілася.

**Некалькі соцень чалавек дайшлі да Кастрычніцкай плошчы, але іх там выціснулі ў мэтро.**

Агулам 21 студзеня было затрымана больш за 20 чалавек. Назаўтра суды Цэнтральнага і Маскоўскага раёнаў сталіцы вынесьлі прысуды затрыманых. Большасьць атрымалі штрафы (ад 500 тыс. да 1 млн 400 тыс. рублёў). Артур Пяцько, Віктар Кукліш і Сяргей Шаўцоў атрымалі па 15 сутак, Аляксей Бондар — 5.

Прадпрымальнікі кажуць, што сваю актыўнасьць цяпер яны скіруюць на рэгіёны. В. Крываль заклікаў дробных гандляроў 28 студзеня ня сплачваць падаткі за люты, а выйсьці да гар- і райвыканкамаў сваіх гарадоў, каб патрабаваць адмены ўказу № 760. Наступная масавая акцыя прадпрымальнікаў у сталіцы заплянаваная на 18 лютага.

**Зьміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Мэтад «выцісканьня»

Болей нідзе ў сьвеце буржуазія не страйкуе, а тым болей ня тузаецца са спэцназам. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Зрэшты, гэта ў іх там — шаноўныя буржуа. А у нас — як былі ў вачох начальства «вашывымі блохамі», так дэ-факта і застаюцца.

Назіральнікі дружна адзначалі: падчас папярэдняй акцыі, 10 студзеня, уладу на нейкі час спаралізавала. На думку аналітыка Валера Карбалевіча, сілавікі маглі нават атрымаць пастфактум прачуханца на самым версе за «выяўленую слабасьць». 21 студзеня спэцназ пад асабістым кіраўніцтвам міністра Навумава без ваганьняў ужыў супраць «вашывых блохаў» сваю ўзорную вывучку. Брутальнасьць дазавалі, пераважаў адпрацаваны мэтад «выцісканьня».

Сама акцыя гэтым разам была, бадай, трохі меней шматлюднай. Усё ж далі свой плён прэвэнтыўная зачыстка ды запалохваньне іншымі шляхамі (праверкі, пагрозы адабраць ліцэнзіі і г. д. — бізуноў багата). Палітоляг Валер Карбалевіч прагназуе, што пратэсты «іпэшнікаў» пакрысе спадуць. Аўтар гэтых радкоў таксама пісаў яшчэ адразу пасьля папярэдняй акцыі, што надзеі тытульнай апазыцыі атрымаць шмат рэкрутаў для «гарачай вясны» могуць ня спраўдзіцца.

Рэч тут ня толькі ў рэпрэсіях, але і ў мэнтальнасьці дробных прадпрымальнікаў. «Наезды» на іх апошнія гады ўлада ладзіла пэрыядычна. І кожны раз спантанныя хваляваньні хутка згасалі. Бізнэсоўцы пачыналі звыкла шукаць абыходныя шляхі, каб ўратаваць сваю справу. Дый іхныя работнікі не гатовыя рэшту жыцьця прысьвяціць палітычным барыкадам. Усё ж айчыннаму «бізнэс-пралетарыяту», кладучы руку на сэрца, ёсьць што губляць, акрамя ўласных ланцугоў.

Цяпер хтосьці зь цяжкім сэрцам рэгіструецца ПУПам, хтосьці афармляе сваіх найманых працаўнікоў як ІП. Карацей, кожны выкручваецца як можа. Буржуазны індывідуалізм, халера яго бяры!

Частка бізнэсоўцаў, дарэчы, пасьля 10 студзеня выказвала незадаволенасьць менавіта тым, што іхныя пратэсты паспрабавала асядлаць тытульная апазыцыя. Маўляў, няма чаго нас у палітыку цягнуць!

У выніку гэтаксама, як з плошчы, «іпэшнікаў» пакрысе, але няўмольна выціскаюць зь іхнай эканамічнай нішы. Адных пашыхтуюць і абкладуць большымі падаткамі ў статуце юрыдычных асобаў, іншых проста выб’юць як непажаданых канкурэнтаў дзяржаўнага сэктару ды прыгрэтага бізнэсу.

Да сапраўднай грамадзянскай супольнасьці і да моцнай палітычнай самасьвядомасьці айчыннаму соцыюму яшчэ далекавата. Усе паасобку: сабе пад нос бурчаць, страціўшы льготы, пэнсіянэры; донары і чарнобыльцы спрабуюць пратэставаць «па сваёй лініі»; аўтаномна, засьцерагаючыся палітычных лёзунгаў, імкнуцца давесьці сваю праўду «іпэшнікі» і г. д. Зь іншага боку, стратэгі ў апазыцыйных штабах зазвычай плятуць пляны паводле ўласных каляндарных цыкляў… Кумулятыўнага эфэкту пакуль што няма. Чым і карыстаецца ўлада, ужываючы звыклы сілавы сцэнар.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Рэформы:
# вярхі ня хочуць, нізы ўжо вагаюцца, бізнэсоўцы — за

У Беларусі насьпела пільная патрэба эканамічных рэформаў, і краіна збольшага гэта пачынае разумець, паказваюць апошнія эканамічныя дасьледаваньні. Піша **Алесь Кудрыцкі**.

Пошукі ўласнага шляху нарэшце вывелі Беларусь на тое месца, зь якога яна іх пачынала — да пункту выбару. Эканоміка, канкурэнтаздольнасьць якой грунтавалася на танных энэрганосьбітах, мусіла прыстасоўвацца да новых, больш высокіх цэнаў. Адразу ж пасьля шоку дзяржава, якая гарантавала хоць і павольны, але сталы рост прыбыткаў, пачала перакладаць клопат пра ўласны дабрабыт на грамадзянаў. Аднак на адным здыманьні льготаў далёка не заедзеш. «Архітэктары» старой мадэлі эканомікі ўсё ж мусяць выбіраць: праводзіць рэформы ці чакаць, пакуль старая сыстэма не абваліцца пад цяжарам праблемаў.

Патрэба ў рэформах робіцца ўсё больш і больш актуальнай, але — ці гатовыя беларусы іх падтрымаць? Што стаіць за ўсплёскам актыўнасьці прадпрымальнікаў? Незадаволенасьць замкнёнай касты гандляроў ці больш шырокі сацыяльны пратэст супраць дзяржаўнай эканамічнай палітыкі? Адказ на гэтае пытаньне можна знайсьці ў новых працах Дасьледчага цэнтру Інстытуту прадпрымальніцтва і мэнэджмэнту (Менск) і Цэнтру сацыяльна-эканамічных дасьледаваньняў CASE (Варшава).

## Адкуль стартуем?

У сьнежні 2007 Аляксандар Лукашэнка заявіў у інтэрвію гішпанскай газэце El Pais, што Беларусь больш падрыхтаваная, чым Польшча і краіны Балтыі, для ўступленьня ў ЭС. Адмыслоўцы Эўрапейскага банку рэканструкцыі і разьвіцьця, аднак, трымаюцца іншай думкі. ЭБРР — адзіная спэцыялізаваная арганізацыя, якая займаецца ацэнкай рынкавасьці эканомікі той ці іншай дзяржавы, выстаўляючы адзнакі ад 1 (цалкам плянавая эканоміка) да 4.33 ці 4 з плюсам (разьвітая рынкавая эканоміка). Дык вось, паводле ЭБРР, Беларусь мае індэкс 1.85. Інакш кажучы, Беларусь вельмі далёкая ад стандартаў разьвітай індустрыйнай эканомікі. Што да краінаў, пра якія казаў Лукашэнка, то цяпер мы знаходзімся на ўзроўні трансфармацыі, на якім яны былі яшчэ ў 1991 г. У 1989 г. Беларусь ды Эстонія мелі ад ЭБРР аднолькавую адзнаку — 1. Цяпер з 28 постсавецкіх краінаў Беларусь займае 2-е месца паводле плянавасьці эканомікі, а Эстонія — 2-е месца паводле блізкасьці да рынкавай эканомікі.

## Ці гатовыя мы да пераменаў?

Але як ацаніць падтрымку рэформаў насельніцтвам? Проста спытацца «вы за рынкавыя рэформы ці супраць?» не выпадае, бо беларусы маюць пра іх самыя розныя ўяўленьні (гэтак, паводле ранейшых апытаньняў Дасьледчага цэнтру ІПМ, амаль 70 % насельніцтва шчыра лічаць, што ў Беларусі праводзяцца рынкавыя рэформы). Таму пытаньні ставілі ня «ў лоб», а ўскосна, вызначаючы стаўленьне рэспандэнтаў да пэўных аспэктаў рэформаў — скажам, да рэгуляваньня цэнаў дзяржавай ці да магчымасьці свабоднага працаўладкаваньня. Нацыянальнае апытаньне для Дасьледчага цэнтру ІПМ рабіла сацыямэтрычная лябараторыя «Новак» (апытана 1148 рэспандэнтаў). Што атрымалася ў выніку?

## Якія рэформы патрэбныя людзям?

Пераважнай большасьці беларусаў патрэбная толькі рэструктурызацыя прадпрыемстваў. Таксама даволі шмат людзей жадае зьменаў на рынку працы. Паводле ўсіх астатніх паказьнікаў колькасьць прыхільнікаў дзяржаўнага ўмяшаньня большая за колькасьць прыхільнікаў рэформаў. Даволі вялікі адсотак тых, хто ня вызначыўся са сваім стаўленьнем да рэформаў. Беларусы ў сваёй масе выступаюць катэгарычна супраць буйной прыватызацыі і супраць прыватнай уласнасьці на зямлю. Многія не жадаюць банкаўскай рэформы. Чаму? «Для людзей гэта малазразумелыя матэрыі, асабліва на тле прапаганды, — кажа А.Чубрык. — А вось у тых сфэрах, зь якімі людзі сутыкаюцца кожны дзень — з рынкам працы, функцыянаваньнем прадпрыемстваў — яны бачаць шмат праблемаў і патрэбу ў рэформах». Гэтак, адказваючы на пытаньні, большасьць рэспандэнтаў пагадзілася з тым, што заробак і занятасьць павінныя рэгулявацца не дзяржавай, а наймальнікам пад кантролем прафсаюзаў. Датычна рэструктурызацыі прадпрыемстваў пытаньне гучала так: «ці варта дзяржаве падтрымліваць стратныя прадпрыемствы?». Большасьць рэспандэнтаў справядліва мяркуюць, што рабіць гэтага ня варта, бо інакш падаткі сыходзяць не туды, куды трэба.

Адмыслоўцы Дасьледчага цэнтру ІПМ вырашылі не дзяліць рэспандэнтаў на «прыхільнікаў» і «ворагаў» рэформаў, а разьбіць іх на драбнейшыя групы: тыя, хто «ня вызначыўся», «рыначнікі» (яны лічаць, што дзяржава ня мусіць умешвацца ў эканоміку), «патэрналісты» (прыхільнікі актыўнага дзяржумяшальніцтва), «прыхільнікі рэгуляванай канкурэнцыі» — то бок тыя, хто разумее, што канкурэнцыя — гэта добра, але мяркуюць, што яна павінная адбывацца пад пільным кантролем дзяржавы. І апошні кластэр — «прыхільнікі рэструктурызацыі без прыватызацыі», то бок гэта людзі, якія вераць у тое, што праводзіцца правільная эканамічная палітыка — трэба толькі палепшыць працу рэальнага сэктару эканомікі.

Калі паглядзець, як разьмеркаваліся рэспандэнты па кластэрах (дыяграма 1), то бачна, што тых, хто ня вызначыўся, у Беларусі большасьць — 31 %. Закаране-

# Рэформы:

## вярхі ня хочуць, нізы ўжо вагаюцца, бізнэсоўцы — за

лыя прыхільнікі плянавай эканомікі («патэрналісты») складаюць ня так і шмат — 21 %. Пасьлядоўных «рыначнікаў» найменш — іх усяго 13 %. «Прыхільнікі рэгуляванай канкурэнцыі» ды «прыхільнікі рэструктурызацыі без прыватызацыі» разам складаюць 35 %. «У прынцыпе, гэта людзі, якія патэнцыйна, паводле большасьці паказьнікаў, зьяўляюцца патэрналістамі — выступаюць за дзяржрэгуляваньне, — кажа А. Чубрык. — Але гэта людзі, якія здольныя зразумець пазытыўнасьць рэформаў у цэлым, калі яны зразумелі пазытыўнасьць іх асобных кірункаў. Таму калі паглядзець на гэты расклад агулам, улічваючы, што 31 % тых, хто ня вызначыўся, будуць вагацца ў сваіх поглядах у залежнасьці ад прапаганды ці рынкавай кан'юнктуры, якая складзецца, то нельга адназначна сказаць, каго ў беларускім грамадзтве болей — тых, хто за рэформы, ці тых, хто за жорсткае кіраваньне эканомікі дзяржавай».

### Што ўплывае на стаўленьне да рэформаў?

Чаму нехта выбірае рэформы, а іншы — плянавую эканоміку? Першае, што кідаецца ў вочы з вынікаў дасьледаваньня — адукацыя. Сярод рыначнікаў практычна адсутнічаюць людзі зь няпоўнай сярэдняй адукацыяй і нашмат больш, чым ва ўсіх астатніх кластэрах, людзей з вышэйшай ды нясконччанай вышэйшай адукацыяй. Пры гэтым сярод патэрналістаў людзей зь няпоўнай сярэдняй адукацыяй значна больш, чым ва ўсіх астатніх кластэрах.

Другі момант, які перадвызначае прыхільнасьць да рэформаў — блізкасьць да Захаду ці сталічнае жыцьцё. «Рыначнікаў» найбольш у Менскай вобласьці, на другім месцы — Менск, а за ім — Берасьцейская вобласьць. Найвялікшы адсотак «патэрналістаў» выявіўся ў Магілёўскай вобласьці — больш за 30 %. Рыначнікаў жа на Магілёўшчыне менш за 2 %.

Больш за 70 % «рыначнікаў» лічаць, што Беларусь павінна ўвайсьці ў Эўрасаюз. Больш за 40 % патэрналістаў лічаць, што Беларусь не павінна ўваходзіць у Эўрасаюз, у той жа час 20 % іх за сяброўства ў ЭС, астатнія вагаюцца. «Складана сказаць, што тут дамінуе — каштоўнасныя рэчы, ці матэрыяльныя зацікаўленасьці, — разважае А. Чубрык. — Магчыма, людзі чакаюць ад ЭС нейкіх выгадаў».

Дасьледаваньне паказвае, што той, хто выступае супраць саюзу Беларусі ды Расеі, схільныя да таго, каб выступаць за рынкавыя рэформы. Зрэшты, згодна з вынікамі апытаньня, ідэя саюзу Беларусі ды Расеі моцна страціла папулярнасьць — менш за 20 % агульнага ліку рэспандэнтаў згодныя з тым, што Беларусь ды Расея павінныя пабудаваць адзіную саюзную дзяржаву.

На пытаньне «ці дапушчальны продаж беларускіх прадпрыемстваў замежнікам?» больш за 60 % «рыначнікаў» адказалі станоўча. Супраць гэтага — больш за палову «патэрналістаў», якія лічаць, што «радзіму прадаваць нельга». «Увогуле, мы бачым, што больш за 40 % беларусаў лічаць недапушчальным продаж беларускіх прадпрыемстваў замежнікам, — заўважае эксьпэрт. — На гэтым фоне вельмі пікантна выглядаюць такія дзеяньні беларускіх уладаў, як продаж замежнікам аднаго з апэратараў мабільнай сувязі».

«Цікава было паглядзець, як зьмяніўся за апошні год матэрыяльны стан людзей, якіх мы апыталі», — кажа Аляксандар Чубрык. У 50 % зьменаў няма, палепшаў ці моцна палепшаў матэрыяльны стан у 20 %, у той жа час пагоршаў ці моцна пагоршаў у больш чым 30 %. Сярод тых, чый матэрыяльны стан пагоршаў, «рыначнікаў» найбольш. Зрэшты, сярод «рыначнікаў», у параўнаньні зь іншымі кластэрамі, таксама болей тых, каму жывецца лепей, чым раней. «Гэта наводзіць на думку, што ў рэформах людзі бачаць нейкую магчымасьць больш зарабіць», — мяркуе эксьпэрт.

Калі мы паглядзім, дзе працуюць людзі, то пабачым, што на прыватных прадпрыемствах «рыначнікаў» нашмат больш за ўсіх астатніх. Сярод «патэрналістаў» людзей, якія працуюць на прыватных прадпрыемствах, амаль няма. А вось на дзяржаўных прадпрыемствах «рыначнікаў» таксама хапае. «Імаверна, тыя, хто працуе на дзяржаўных прадпрыемствах, бачаць іх праблемы і разумеюць патрэбу ў рэформах. А тыя, хто працуе на прыватных, бачаць, што ўсё працуе даволі добра, і думаюць, што і ўсю краіну варта было б перавесьці на рынкавыя рэйкі, — разважае А. Чубрык. — Патэрналісты», відаць, зарабляюць крыху болей, чым «рыначнікі», якія працуюць на дзяржаўных

**1. Стаўленьне насельніцтва да рынкавых рэформаў**




**2. Стаўленьне прадпрымальнікаў да рынкавых рэформаў**



прадпрыемствах, таму яны вераць у тое, што дзяржаўная ўласнасьць найбольш эфэктыўная». Акрамя гэтага заўважна, што даволі шмат «патэрналістаў» не працуюць — у асноўным гэта пэнсіянэры. Так што ўзрост мае выразнае значэньне ў стаўленьні да рэформаў.

## Бізнэсоўцы — за рэформы

Апытаньне, якое праводзілася Цэнтрам сацыяльна-эканамічных дасьледаваньняў CASE (Варшава), вывучала тую самую праблему — стаўленьне да эканамічных рэформаў — але ўжо менавіта ў прадпрымальніцкім асяродку. Яно праводзілася незалежна ад дасьледаваньня ІПМ, аднак падабенства многіх высноваў дазваляе сьцьвярджаць, што інфрмацыя, якую атрымалі ў выніку — слушная. Мэтай CASE было зразумець, як беларускі прыватны бізнэс ставіцца да трансфармацыяў. «Беларускі прыватны бізнэс працуе ў вельмі скажоным асяродзьдзі, дзе няма нармальнага рынку, дзе моцнае ўмяшаньне ўлады ў эканоміку, — кажа Пётра Казаржэўскі, сябар рады і экспэрт CASE. — Здолеўшы выжыць у такіх умовах, ён адаптаваўся да іх, немінуча пераняў адпаведныя мадэлі паводзінаў. Ці ня будзе яму цяжка ад іх адмовіцца? Ці прыме ён новыя правілы гульні, якія будуць усталяваныя пасьля будучых эканамічных рэформаў?»

Дасьледаваньне праводзілася па рэпрэзэнтатыўнай выбарцы — апыталі ўладальнікаў ці топ-мэнэджараў 517 прыватных прадпрыемстваў краіны. Галоўная выснова: у параўнаньні з насельніцтвам, прадпрымальнікі трымаюцца нашмат больш рынкавых поглядаў. 85 % у цэлым выступае за рынак. А калі ўзяць перакананых «плянавікоў», то іх усяго толькі 2 %.

Сярод прадпрымальнікаў найбольш папулярныя ідэі, зьвязаныя з рэформамі, якія палегчаць вядзеньне ўласнага бізнэсу, рэгуляваньне занятасьці і заробкаў, цэнаўтварэньне. Менш падтрымліваюцца пытаньні, якія датычацца пэўнага ўтрыманьня дзяржавай плянавых вышыняў у эканоміцы. Перш за ўсё гэта датычыць уласнасьці на нейкія найбуйнейшыя найважнейшыя аб'екты — інфраструктура, зямля, буйныя прадпрыемствы. А другое пытаньне — захаваньне нейкай дзяржаўнай падтрымкі для айчынных вытворцаў і абарона іх ад замежнай канкурэнцыі.

Незалежна ад Дасьледчага цэнтру ІПМ, адмыслоўцы CASE выдзелілі такія самыя 5 групаў-кластэраў сярод прадпрымальнікаў (дыяграма 2). Рыначнікі-лібэралы складаюць сярод бізнэсоўцаў 32 %, «патэрналісты» — толькі 9 %. Тыя, хто выступае за ў цэлым рынкавыя адносіны пры вялікай ролі дзяржавы ў рэгуляваньні гэтага рынку, складаюць 15 %. 13 % прадпрымальнікаў можна назваць «дзяржкапіталістамі» — гэта тыя самыя прыхільнікі рэструктурызацыі без прыватызацыі. Тых, хто ня вызначыўся са сваім стаўленьнем да рынкавых рэформаў, сярод бізнэсоўцаў 31 %, акурат столькі ж, колькі ў сярэднім па краіне.

## Першапраходцы-рэфарматары і будаўнікі-рэтраграды

«Агульны настрой прадпрымальніцкага асяродку несувымерна больш рынкавы, чым насельніцтва краіны, пры тым, што структура гэтых поглядаў у вялікай ступені падобная», — адзначае Пётра Казаржэўскі.

Найбольш лібэральнымі выявіліся «першапраходцы» — тыя, хто заснаваў свой бізнэс да 1996 г. Той, хто кіруе ці валодае буйным прадпрыемствам, таксама найчасьцей схільны да лібэральных поглядаў. Найбольшыя «рыначнікі» — кіраўнікі тых прадпрыемстваў, якія прадаюць свае тавары на рынках ЭС, і перш за ўсё на рынках новых чальцоў Эўрасаюзу. Цікавы факт: калі прадпрыемства знаходзіцца ў дрэнным эканамічным стане, яго кіраўнік таксама часьцяком схіляецца да падтрымкі рынкавых рэформаў, бо ў ягоных вачах адсутнасьць рынкавых адносінаў успрымаецца як тормаз для разьвіцьця.

«Патэрналісцкімі» поглядамі вылучаюцца кіраўнікі прадпрыемстваў, заснаваных адносна нядаўна. Іх стваральнікі ведалі, на што ідуць, былі гатовыя функцыянаваць ва ўмовах няпоўнай бізнэс-свабоды, уключаючы яе ў сваю бізнэс-стратэгію. Таксама спрыяе «патэрналізму» добры эканамічны стан прадпрыемства. «Тая стратэгія, якую праводзіць прадпрыемства ў сучасных умовах, успрымаецца як пасьпяховая, і зьмены ў вонкавых абставінах выглядаюць як пагроза», — тлумачыць экспэрт CASE.

У геаграфічным пляне найбольш «патэрналістаў» у бізнэс-колах Магілёўшчыны. З пункту гледжаньня віду дзейнасьці, найбольш кансэрватыўнай выяўляецца будаўнічая галіна. Увогуле, 9 % бізнэсмэнаў-«патэрналістаў» — гэта збольшага прадпрымальнікі, якія займаюць вельмі вузкія рынкавыя нішы. Яны з задавальненьнем перайшлі б пад крыло дзяржавы, дзе пачуваліся б камфортна, каб дзяржава пакрывала іхныя рызыкі, гарантуючы прыбытак.

Цікава, што нават бізнэсоўцы-лібэралы лічаць, што нейкая форма дзяржпадтрымкі павінная існаваць, найперш для айчынных вытворцаў, а таксама высокатэхналягічнай і навукаёмістай галіны. Як выглядае, нашыя прадпрымальнікі ўжо здольныя да шырокага стратэгічнага мысьленьня ў нацыянальным маштабе.

95 % прадпрымальнікаў падтрымліваюць прыватызацыю. Пры гэтым 45 % лічаць, што магчымасьць удзелу любога замежнага капіталу ў прыватызацыі павінна быць абмежаваная, а 20 % лічаць, што абмежаваньні павінны быць уведзеныя менавіта для расейскага капіталу. Найперш мусяць прыватызавацца малыя прадпрыемствы (так лічаць 77 % прадпрымальнікаў). За прыватызацыю буйных прадпрыемстваў выказваюцца крыху меней за палову (48 %), за прыватызацыю зямлі — 43 %, інфраструктуры — 39 %.

63 % прадпрымальнікаў зацікаўленыя ўдзельнічаць у прыватызацыі, але калі ўжо ўдзельнічаць, дык не лавіць рыбу ў мутнай вадзе — яны жадаюць, каб усё было празрыста.

## Высновы

Такім чынам, беларускія бізнэсоўцы і топ-мэнэджары вельмі станоўча глядзяць на магчымасьць рынкавых рэформаў, але жадаюць, каб яны былі дастаткова мяккімі, паступовымі. Усе прадпрымальнікі рэальна ацэньваюць сваю магчымасьць канкураваць на адкрытых рынках. У большасьці яны гэтых рынкаў баяцца. Таксама бізнэс не жадае, каб дзяржава самадыстанцыянавалася. Яна мусіць і надалей падтрымліваць айчынных вытворцаў і захоўваць кантроль над найважнейшымі аб'ектамі. «Гэта мусіць быць рынак «для сваіх» — рынак, абкладзены падушкамі», — кажа Пётра Казаржэўскі. У цэлым, бізнэс можа быць натуральным хаўрусьнікам палітыкаў-рэфарматараў. Праявдзеньне дзяржавай рэальнай рынкавай палітыкі было б сустрэтае імі на «ўра». Нядаўнія пратэсты прадпрымальнікаў выкліканыя, натуральна, канкрэтнымі прычынамі — людзей моцна прыціснула. Але, як вынікае, прадпрымальнікі ня толькі дбаюць пра ўласную кішэню, але маюць пэўныя каштоўнасныя ўстаноўкі, цэняць рынкавую свабоду — а значыцца, будуць мець жаданьне за яе змагацца.

Што да насельніцтва ўвогуле, то яно, хоць і не з такім энтузіязмам, але пакрысе звыкаецца з думкай, што рэформы патрэбныя. Дасьледаваньні паказваюць, што калі нейкая трансфармацыя сапраўды будзе распачатая ў бліжэйшы час, то маштаб яе падтрымкі ў краіне будзе не такі ўжо малы. Рэформы выклічуць падвышэньне долі прыватнага бізнэсу, а значыцца, усё больш і больш людзей будуць атрымліваць станоўчы досьвед працы ў ім. «Пачатак рынкавых рэформаў можа спарадзіць ланцуг, калі рэформы будуць весьці да большай падтрымкі, а большая падтрымка — будзе весьці да далейшых рэформаў», — мяркуюць экспэрты CASE і Дасьледчага цэнтру ІПМ.

# Даляр расьце, нафта падае

Абвал на фондавых рынках, зьмена эканамічных тэндэнцыяў.


PHOTO.BYMEDIA.NET

21 студзеня на эўрапейскіх фондавых рынках адбыўся самы моцны за апошнія гады абвал.

У Парыжы, Лёндане й Фракфурце каціроўкі вядучых кампаніяў зьнізіліся на 6—7% праз трывожныя чаканьні эканамічнага спаду ў ЗША. Гэтаму папярэднічаў абвал на азіяцкіх рынках і ў Расеі.

У Расеі біржавы індэкс панізіўся на 7% за адзін панядзелак, пасьля яшчэ на 4,8% за аўторак, а ўсяго на 19% — ад 16 студзеня, калі пачалося падзеньне.

Цэны на нафту таксама пайшлі ўніз. Яны дасягнулі ўзроўню месячнай даўніны — 88 даляраў за барэль.

Адначасова другі дзень запар умацоўваецца даляр. За 1 эўра ў панядзелак давалі 1,45 даляра. Чакаецца далейшы рост амэрыканскай валюты. Гэта зьвязана з тым, што эканамічныя прагнозы для зоны эўра горшыя, чым для ЗША. Таксама амэрыканскія ўлады раней за эўрапейскія адрэагавалі на зьніжэньне гаспадарчай актыўнасьці, што мае раней даць вынікі. Таксама даляр застаецца галоўнай рэзэрвовай валютай, і інвэстары, напалоханыя падзеньнем фондавых рынкаў, сьпяшаюцца перавесьці свае актывы ў даляры.

У аўторак Фэдэральны рэзэрвавы банк ЗША абвесьціў пра самае значнае за апошнія 26 гадоў — аж на 0,75% зьніжэньне стаўкі рэфінансаваньня, каб стымуляваць гаспадарчую актыўнасьць і прыпыніць рост даляра (дарагі даляр тармозіць экспарт і пампуе імпарт).

Што цікава, найбольшае падзеньне ў Расеі зазналі акцыі нафтавых кампаніяў. Прычына — усеагульнае чаканьне эканамічнага спаду, які будзе суправаджацца падзеньнем попыту на нафту.

Аналітыкі на фондавых рынках называюць першапрычынай падзеньня фондавага рынку іпатэчны крызіс у ЗША. Амэрыканская эканоміка застаецца лякаматывам усясьветнай.

Пакуль цяжка сказаць, ці ўдасца ўрадам сьвету спыніць спаўзаньне гаспадаркі ў стагнацыю. Амэрыканскі ўрад ужо прапанаваў пакет мераў па стымуляваньні эканомікі коштам 140 мільярдаў даляраў.

У падзеньні фондавых рынкаў ці гаспадарчай рэцэсіі няма нічога надзвычайнага. Гэта праява звыклай цыклічнасьці ў эканоміцы. Этапы доўгага і хуткага росту перамяжаюцца пэрыядамі спаду.

Новыя тэндэнцыі на ўсясьветных рынках нэгатыўна адаб'юцца на тэмпах росту беларускай эканомікі. Аднак, як і гаспадаркі іншых «новых рынкаў» (Кітай, Паўднёва-Ўсходняя Азія), яна, можна чакаць, панясе меншыя страты, чым Эўропа і ЗША.

**Мікола Бугай**

# Украіна загаварыла з Расеяй па-лукашэнкаўску

Украіна хоча павялічыць стаўку за пракачку 1 тыс. куб. м расейскага газу з Эўропы па 100 км тэрыторыі краіны з $1,7 да $9,32. Акрамя таго, Кіеў будзе дамагацца ліквідацыі пасярэдніцкай кампаніі RosUkrEnergo. «Газпром» пацьвердзіў гатоўнасьць перайсьці да наўпроставых паставак газу ва Ўкраіну і назваў цану саступкі — $7,43 млрд дадатковых плацяжоў. Украіна гатовая да такога павароту, заявіў адзін з профільных чыноўнікаў. Пры ўмове, што транзыт расейскага газу па тэрыторыі Ўкраіны будзе адбывацца паводле прапановы Алега Дубіны: у такім разе прыбытак ад транзыту акупіць выдаткі ад саступкі «Газпрому».

Дырэктар Інстытуту глябальных стратэгіяў Вадзім Карасёў лічыць, што Юлія Цімашэнка сьвядома ідзе на канфрантацыю, выкарыстоўваючы тактыку, якую пасьпяхова апрабаваў у дачыненьнях з «Газпромам» А. Лукашэнка.

**Сямён Печанко**

## СЬЦІСЛА

### Расейцы купляюць паліграфкамбінат імя Коласа

Буйны расейскі інвэстар плянуе набыць кантрольны пакет акцыяў ААТ «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа». Пра гэта паведаміў генэральны дырэктар прадпрыемства Валерый Германаў. «Мы будзем толькі радыя, калі кантрольны пакет акцыяў прадпрыемства купіць расейскі інвэстар», — сказаў ён. Продажам займаецца Міністэрства інфармацыі, а купляць будзе расейскі выдавецкі холдынг «АСТ». 95% магутнасьцяў прадпрыемства загружаныя замовамі з Расеі.

### Цэмэнтавы нумар 4

Паўторны конкурс па выбары інвэстара для прамысловай распрацоўкі радовішча вапны «Падкаменьне» ў Веткаўскім раёне, што на Гомельшчыне, зладзіць Дзяржкамітэт па маёмасьці 12 сакавіка. На базе гэтага радовішча будзе будавацца новы ў Беларусі цэмэнтавы завод магутнасьцю да 2 млн т цэмэнту ў год сухім спосабам. Паводле ўмоваў конкурсу 70% ад агульнага аб'ёму вытворчасьці прадукцыі інвэстар можа экспартаваць па ўласных каналах, а рэшту павінен пастаўляць на ўнутраны рынак Беларусі па рэгуляваных цэнах. Да беларускіх цэмэнцярняў прыглядаюцца найперш азіяцкія інвэстары. Кітай дае крэдыт у памеры $600 на мадэрнізацыю беларускіх заводаў. Акрамя таго, расейскі мільярдэр Алег Дзерыпаска агучыў пляны набыцьця некалькіх цэмэнтавых заводаў, у тым ліку і ў Беларусі. На сёньня ў Беларусі дзьве цэмэнцярні, пачалася пабудова яшчэ адной, на базе радовішча пад Маларытай.

### ПУПамі сталі толькі 2 тыс. прадпрымальнікаў

Яшчэ амаль 46 тыс. індывідуальных прадпрымальнікаў, якія мелі наёмных работнікаў, не перайшлі ў ПУП або іншую форму юрыдычнай асобы.

**СП, МБ**

# Мікалай Аўтуховіч: Раней я адзін змагаўся за свае правы, цяпер такіх шмат

18 студзеня зь менскай калёніі быў вызвалены ваўкавыскі прадпрымальнік **Мікалай Аўтуховіч**. 7 ліпеня 2006 г. Мікалая Аўтуховіча зьняволілі на тры з паловай гады, абвінавáціўшы ў няўплаце падаткаў у асабліва буйным памеры. Тэлефонны званок ад карэспандэнта «Нашай Нівы» засьпеў Мікалая Аўтуховіча ўжо недалёка ад роднага Ваўкавыску.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

При канцы сьнежня 2007 г. суд пастанавіў сканфіскаваць у М. Аўтуховіча 13 таксовак, кватэру і два склады. Сужэнству, аднак, пакінулі дом, які належыць ім разам. У зьняволенага засталася таксама аўтабаза, палова ягоных таксовак і адзін асобны будынак.

**«Наша Ніва»: Спадар Аўтуховіч, раскажыце, як адбывалася вызваленьне?**

**Мікалай Аўтуховіч:** Гэта было абсалютнай нечаканасьцю. Падаецца, што ня толькі для мяне, але і для ахоўнікаў у турме. Відавочна, што яно было незапланаванае. Пасьля сямі вечару да мяне ў камэру пачалі заходзіць міліцыянты, якія давалі на подпіс паперы аб датэрміновым вызваленьні. Хаця маю справу павінныя былі разглядаць не раней за красавік. Яшчэ ніколі не практыкавалася, каб паперы на вызваленьне вязьня афармлялі пасьля шостай вечару. Сёньня ж у калёніі адбыўся суд, прыехалі судзьдзя і пракурор, я нават не зразумеў, хто зь іх хто. Задалі некалькі пытаньняў, пасьля чаго мяне вызвалілі.

**«НН»: З чым Вы зьвязваеце гэтае вызваленьне?**

**МА:** Мне абсалютна відавочна, што была дадзеная нейкая каманда зьверху. Гэтыя людзі проста так нічога ня робяць. Дзіўлюся, што вызвалены толькі я. Думаў, што на волі апынуліся ўсе палітвязьні. Рашэньне відавочна палітычнае. Сёньня на судзе мне паведамілі, што я маю два мільярды нясплачаных пазыкаў. Іх мне прысудзілі 27 сьнежня. Запыталі, ці зьбіраюся я іх сплачваць. Адказаў шчыра: «З чаго?». Нягледзячы нават на гэта, мяне выпусьцілі.

**«НН»: Што будзеце рабіць зараз?**

**МА:** Разумееце, мяне вызвалілі ня цалкам. Проста замянілі зьняволеньне на папраўчыя работы. У панядзелак я мушу зьявіцца ў ваўкавыскую міліцыю, каб стаць на ўлік. Маю дакумэнт ад маіх сяброў, якія гатовыя ўзяць мяне на працу.

**«НН»: Ці цяжка было перанесьці два гады за кратамі?**

**МА:** Нялёгка. Асабліва, калі разумееш, што ні ў чым не вінаваты. Спачатку, калі толькі сядзіш у камэры і нікуды не выходзіш, то думаеш, што можна звар'яцець. Але чалавек такая істота, якая можа да ўсяго прызвычаіцца. Вакол мяне сабралася група аднадумцаў, зь якімі ўвесь час кантактаваў. Чытаў кніжкі, пісаў лісты. Нічога страшнага ў турме няма, мне даводзілася праходзіць выпрабаваньні і больш складаныя. Гэта ўсё ж не вязьніцы 1937-га году. Абыходзіліся са мной таксама нармальна, ніякіх нараканьняў у бок аховы няма.

**«НН»: А як здароўе?**

**МА:** Канечне, падарвалася. Не магу цяпер ужываць тлустую ежу. Патрэбная толькі дыетычная. Шмат чаго яшчэ. Трэба прайсьці нармальнае мэдычнае абсьледаваньне. Пасьля гэтага, мабыць, лягу ў шпіталь, каб крыху падлячыцца.

**«НН»: А бізнэс аднаўляць ня думаеце?**

**МА:** Бізнэс? На сёньняшні момант у гэтым няма сэнсу. Трэба вырашаць іншыя пытаньні, каб такія людзі, як я, маглі свабодна займацца бізнэсам. Бо нават калі я і аднаўлю сваю справу, то гэта ня значыць, што праз пэўны час мяне ня змогуць зноў пасадзіць у турму. Трэба рабіць так, каб не было вось такога. Раней я быў адзін, які змагаўся за свае правы, цяпер такіх шмат. Яны змагаюцца і, мяркую, дамогуцца свайго. Усяляк іх буду падтрымліваць.

**«НН»: З Вашых словаў можна зразумець, што Вы сабраліся ў палітыку?**

**МА:** Я ўжо ў палітыцы, мне няма куды адступаць. У нашай краіне кожны, хто незадаволены нечым, робіцца палітыкам.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

# Садзяць за маргінальнае, каб немаргіналы баяліся

Менскі гарадзкі суд вынес беспрэцэдэнтна жорсткі прысуд па справе былога намесьніка рэдактара газэты «Згода» Аляксандра Зьдзьвіжкова. Ён атрымаў тры гады зьняволеньня ў калёніі ўзмоцненага рэжыму за перадрук дацкіх карыкатураў на прарока Мухамэда. Тыя карыкатуры былі перадрукаваныя ў 143 выданьнях 56 краінаў, у тым ліку ісламскіх, і нідзе журналісты ня трапілі за тое ў турму.

Журналіст Аляксандар Зьдзьвіжкоў прызнаны вінаватым у парушэньні артыкулу 130 ч 2. КК «Распальваньне рэлігійнай варажнечы» і асуджаны да трох гадоў зьняволеньня з адбываньнем пакараньня ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Санкцыі паводле гэтага артыкулу прадугледжвалі пакараньне ад 3 да 10 гадоў турмы.

Крымінальная справа супраць Зьдзьвіжкова і газэты «Згода» была заведзеная ў лютым 2006 г., напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў, за зьмяшчэньне ў выданьні карыкатураў на прарока Мухамэда, якія раней былі надрукаваныя ў дацкай газэце Jyllands Posten. «Згоду» тады зачынілі, а скончыць справу супраць Зьдзьвіжкова не змаглі, бо той некуды зьнік. Суд тады пастанавіў прыпыніць сьледзтва праз адсутнасьць галоўнага абвінавачанага.

Арыштавалі А. Зьдзьвіжкова 18 лістапада 2007 г., калі ён прыехаў у Барысаў, каб наведаць магілу бацькі. З таго часу журналіст знаходзіўся пад вартай у сьледчым ізалятары КДБ, дзе яму не дазвалялі сустрэцца з адвакаткай Марыяй Аляксандравай. Паводле інфармацыі сваякоў Зьдзьвіжкова, ён хаваўся ў манастыры ці то ў Расеі, ці ва Ўкраіне.

Судовы працэс па справе А. Зьдзьвіжкова пачаўся 11 студзеня ў Менскім гарадзкім судзе. Абвінавачаны адразу заявіў хадайніцтва аб адводзе судзьдзі Руслана Аніскевіча, які, дарэчы, вёў працэс пяцёх «маладафронтаўцаў», але адвод не задаволілі. Падчас перапынку журналістаў папрасілі выйсьці з залі паседжаньняў. Прапаршчык міліцыі абяцаў, што ўсіх паклічуць пасьля таго, як працэс адновіцца. Аднак нікога ў залю так і не ўпусьцілі. Прысутныя даведаліся, што працэс зрабіўся закрытым усё ад таго ж прапаршчыка. Давялося зьвяртацца да старшыні суду Міхаіла Ардзякі, які ўзяў бок прэсы.

Урэшце, Руслан Аніскевіч быў вымушаны перапрасіць за адсутнасьць аб’явы, што працэс стаў закрытым. Аказалася, што пракурор Вярэнчыкаў палічыў, што суд павінен быць закрытым, бо інфармацыя пра працэс у прэсе нейкім чынам можа абразіць рэлігійныя пачуцьці мусульман. Варта адзначыць, што лідэры беларускіх мусульман выказваліся супраць пакараньня Зьдзьвіжкова.

Цягам тыдня адбываліся допыты сьведкаў па справе. Выніковую частку прысуду судзьдзя Руслан Аніскевіч агучваў публічна 18 студзеня. Пракурор Аляксей Вярэнчыкаў патрабаваў пакараць А. Зьдзьвіжкова чатырма гадамі зьняволеньня. Суд вырашыў зьменшыць пакараньне да трох гадоў калёніі ўзмоцненага рэжыму.

Прысуд можа быць абскарджаны цягам 10 дзён і спадар Зьдзьвіжкоў, які сваёй віны не прызнае, заявіў, што гэтай магчымасьцю скарыстаецца.

Колькасьць палітычных вязьняў у Беларусі імкліва ўзрастае.

**Зьміцер Панкавец**

## Ісмаіл Варановіч:
# «Мяне прымусілі напісаць гэты ліст»

Старшыня Духоўнага ўпраўленьня мусульман Беларусі распавёў, чаму на судзе ён фактычна абараняў рэдактара «Згоды», аб тым, што карыкатуры яму паказаў Камітэт па справах рэлігій, і чаму ён лічыць, што скандальную публікацыю варта лічыць проста інфармацыяй аб тым, што было апублікавана ў эўрапейскай прэсе.

**— Вы ведаеце, наколькі мусульмане Беларусі былі незадаволеныя гэтай публікацыяй?**

— Дык яны ж не паспелі нават і ведаць, што такая публікацыя была. Калі мяне пазнаёмілі з ёй органы ўлады, я быў змушаны напісаць ліст, адрэагаваць. Гэта мне так паведамілі як кіраўн-


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ


PHOTO.BYMEDIA.NET

іку Духоўнага упраўлення мусульман Рэспублікі Беларусь.

**— А куды Вы гэты ліст пісалі?**

— У той жа самы орган, якога мяне азнаёміў з публікацыяй. Гэта Камітэт па справах рэлігіі і нацыянальнасцяў.

**— Вы пісалі, што абураныя?**

— Бо гэта было паднесена так, таму я быў змушаны зрабіць.

**— Вам нават не паказвалі газету?**

— Паказалі. Паказалі ксеракопіі, далі мне.

**— Рэдактар газеты «Згода» звярнуўся да мусульман з просьбай дапамагчы выратаваць Здзвіжкова ад турмы...**

— Яшчэ трэба ўзважыць становішча. Узважыць усю навакольную абстаноўку. Як гэта адаб'ецца на нас. Мы ж меншасць, нас жа, мусульман Беларусі, вельмі мала. Таму мы вельмі павінны быць асцярожныя.

**Эўрарадыё**

Ад часу свайго зьяўленьня восеньню 2005 г. у малавядомай дацкай газэце Jyllands-Posten карыкатуры на прарока Мухамэда былі перадрукаваныя ў 143 выданьнях у 56 краінах сьвету. У рэдкіх выпадках справа дайшла да суду. Аднак прысуд, вынесены беларускім судом, беспрэцэдэнтна жорсткі нават у параўнаньні з мусульманскімі краінамі.

**Малайзія, люты 2006:** Часова прыпынены выхад трох газэт, якія перадрукавалі карыкатуры.

**Данія, сакавік 2006:** Пракуратура адмовілася заводзіць справу супраць газэты Jyllands-Posten, якая першай апублікавала карыкатуры на прарока Мухамэда, бо артыкул «Твар Мухамэда», праілюстраваны сатырычным коміксам з 12 малюнкаў, не парушыў дацкіх законаў.

**Беларусь, сакавік 2006:** Аляксандар Лукашэнка ў часе выступу на Ўсебеларускім народным сходзе: «Газэта [«Згода»] будзе зачыненая, крымінальная справа ўсчатая, а калі будуць падставы, то ўсе датычныя да гэтага будуць сядзець у турме, таму што гэта правакацыя супраць дзяржавы»

**сакавік 2006:** Карыкатуры былі перадрукаваныя ў 143 выданьнях 56 краін, у тым ліку ў Альжыры, Босьніі й Герцагавіне, Эгіпце, Інданэзіі, Ярданіі, Малайзіі, Марока і Саудаўскай Арабіі — краінах зь пераважна мусульманскім насельніцтвам.

**Расея, травень 2006:** У Волагдзе апраўданая галоўная рэдактарка гарадзкой газэты «Наш рэгіён» Ганна Сьмірнова, якая перадрукавала карыкатуры.

**Ярданія, травень 2006:** Ярданскія журналісты атрымалі па два месяцы турмы за карыкатуры. У залі суду яны былі вызваленыя пад заклад.

**Емэн, лістапад 2006:** Галоўны рэдактар мясцовай газэты Al-Rai Al-Aam («Грамадзкая думка») Камаля аль-Ольфі (Kamal al-Olfi) быў асуджаны на год турэмнага зьняволеньня, аднак генпракурор адмяніў рашэньне, заявіўшы, што турма будзе занадта сур'ёзным пакараньнем за перадрукоўку.

**Францыя, сакавік 2007:** Парыскі суд зьняў абвінавачаньні з галоўнага рэдактара часопісу «Шарлі Эбдо» Філіпа Валя. У падтрымку выданьня выступіў сярод іншых кіраўнік МУС Францыі і тады яшчэ кандыдат у прэзыдэнты Нікаля Саркозі, які адправіў у адраз журналістаў ліст з ухваленьнем.

**Ірак, ліпень, 2007:** Кіраўніцтва «Аль-Каіды» аб'явіла ўзнагароду 100 тысячаў даляраў за забойства швэдзкага карыкатурыста Ларса Вілкса (Lars Vilks), які намаляваў карыкатуры на прарока Мухамэда.

**Іран, студзень 2008:** суд прыгаварыў старшыню фэдэрацыі настаўнікаў Ірану да трох гадоў турэмнага зьняволеньня за абразу прарока Мухамэда. Падрыхтаваныя ім экзамэнацыйныя пытаньні былі прызнаныя недастаткова паважнымі ў дачыненьні да прарока. Іран – ісламская рэспубліка, правасудзьдзе якой заснаванае на законах шарыяту.

**АК**

# У Менску зьнясуць гатэль «Беларусь»

Адначасова ў сталіцы паўстануць пяцізоркавыя «Кемпінскі» і «Хаят».

На месцы гатэля «Беларусь» у Менску мае быць узьведзены бізнэс-цэнтар. Прэзэнтацыя гэтага праекту адбылася 22 студзеня ў Менскай ратушы ў час азнаямленьня Аляксандра Лукашэнкі з генэральным плянам забудовы праспэкту Машэрава.

На думку спэцыялістаў, цяпер эксплюатацыя гатэлю «Беларусь» малаэфэктыўная. Яго ўнутраныя памяшканьні не адпавядаюць міжнародным патрабаваньням, а невялікія нумары не даюць магчымасьці рэканструяваць будынак. Акрамя таго, няма магчымасьцяў для абсталяваньня гэтага будынка эфэктыўнай сыстэмай інжынэрнага забесьпячэньня.

На месцы гатэля «Беларусь» паўстане сучасны архітэктурны ансамбль. Комплекс будзе складацца з трох вежаў, у дзьвюх зь іх разьмесьціцца гатэль, у трэцяй — бізнэс-цэнтар. Вышыня будынкаў складзе 40—45 паверхаў. На верхніх паверхах разьмесьцяцца некалькі рэстаранаў з агляднымі пляцоўкамі. Плянуецца таксама, што новы гатэль будзе зь верталётнай пляцоўкай.

Таксама ў Менску зьявіцца аквапарк — на тэрыторыі, прылеглай да Драздоўскага вадасховішча. Аквапарк будзе мець агульную плошчу звыш 14 тыс.кв.м. Арыенціровачны кошт аб’екта складзе $45 млн. Усяго ў раёне праспэкту Машэрава плянуецца пабудаваць ці рэканструяваць 25 аб’ектаў.

Зьвяртае ўвагу, што ў Беларусь прыйдуць усясьветныя гатэльныя сеткі. Каля Палаца Рэспублікі збудуюць гатэль «Кемпінскі», а каля Камсамольскага возера — «Хаят».

**Зьміцер Панкавец**


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Мін’юст прабачыў «Пэрспэктыве»

калі тая адмежавалася ад Шумчанкі.

Нагодай стаў пакаяльны ліст кіраўнічага органу арганізацыі ў міністэрства, у якім абяцаецца даць ацэнку кіраўніку арганізацыі Анатолю Шумчанку, якога «не ўпаўнаважвалі на ўдзел у несанкцыянаванай акцыі 10 студзеня».

Міністэрства юстыцыі прыняло рашэньне адклікаць пазоў аб ліквідацыі дадзенага грамадзкага аб’яднаньня зь Вярхоўнага суду Беларусі, паведамляе БЕЛТА.

У Мін’юсьце паведамілі, што ў міністэрства паступіў зварот РГА «Пэрспэктыва», у якім яно паінфармавала, што кіраўнічыя органы не прымалі рашэньня наконт удзелу кіраўніка іхнай арганізацыі ў несанкцыянаванай акцыі. Шумчанка, гаворыцца ў звароце, не надзяляўся паўнамоцтвамі прадстаўляць грамадзкае аб’яднаньне на якіх-небудзь масавых мерапрыемствах, а таму 11 лютага на Радзе грамадзкага аб’яднаньня будзе дадзеная ацэнка ягоным дзеяньням 10 студзеня і будзе вырашанае пытаньне аб сумяшчальнасьці такой дзейнасьці з пасадай кіраўніка РГА.

«У адпаведнасьці з палажэньнямі статуту арганізацыі мэтамі яе дзейнасьці зьяўляюцца стварэньне ўмоваў, скіраваных на разьвіцьцё прадпрымальніцтва ў рэспубліцы, спрыяньне прыцягненьню органаў улады да праблемаў, што ўзьнікаюць. Улічваючы выкладзенае, а таксама супадзеньне мэтаў дзейнасьці дадзенага грамадзкага аб’яднаньня з курсам дзяржавы на ўмацаваньне і разьвіцьцё малога бізнэсу, прынятае рашэньне аб адкліканьні зь Вярхоўнага суду пазову аб ліквідацыі РГА «Пэрспэктыва», паведамілі ў Мін’юсьце.

Варта адзначыць, што кіраўніка «Пэрспэктывы» Анатоля Шумчанку затрымалі пасьля заканчэньня прадпрымальніцкай акцыі 10 студзеня і асудзілі на 15 сутак арышту.

Нагадаем, што адразу пасьля заявы Мін’юсту аб намеры зьліквідаваць «Пэрспэктыву», Партыя БНФ заявіла пра гатоўнасьць прыняць у свае шэрагі сябраў арганізацыі.

Раней намесьніца старшыні рады РГА «Пэрспэктыва» Вольга Круміна заявіла, што ў выпадку ліквідацыі «Пэрспэктывы» сябры арганізацыі ініцыююць стварэньне палітычнай партыі прадпрымальнікаў. У найгоршым выпадку не выключаўся варыянт далучэньня да адной з дзейных апазыцыйных палітычных арганізацыяў.

**Сямён Печанко**

# Лукашэнка: «Улада не павінна быць раз і назаўсёды застылай»

«Працэс ратацыі кіроўных кадраў у Беларусі будзе прадоўжаны», — заявіў А. Лукашэнка, прадстаўляючы Мікалая Дамашкевіча на пасадзе кіраўніка справаў прэзыдэнта. «Перад намі стаяць сур’ёзныя задачы. Улада не павінна быць раз і назаўсёды застылай. Таму будуць праводзіцца зьмены, адпаведныя ратацыі», — падкрэсьліў А. Лукашэнка. Паводле яго словаў, «на пасады мусяць прыйсьці ініцыятыўныя людзі, якія добра сябе зарэкамэндавалі». Экс-кіраўніку справаў прэзыдэнта Аляксандру Кулічкову прапанаваная высокая пасада ў «саюзнай дзяржаве».

**ЗП; БЕЛТА**

# Чарговы немец узначаліць офіс АБСЭ

Улады далі дазвол на працяг працы ў Менску офісу АБСЭ.

Офіс АБСЭ надалей будзе працаваць пад кіраўніцтвам нямецкага дыплямата — Ганса-Ёхэна Шміта, які зойме гэтую пасаду ўжо ў лютым. Раней ён працаваў консулам у Санкт-Пецярбургу і Казахстане, намесьнікам пасла ва Украіне. Раней офіс АБСЭ ўжо ўзначальвалі немцы — Ганс-Георг Вік і Эбэрхарт Хайкен, а таксама швэд Оке Пэтэрсан.

**ЗП**

# Дзякуй

**А.Т., І.З., Марыі Н.** зь Менскага раёну.

**Уладзімеру Л.** са Смургонскага раёну.

**Вадзіму Б.** са Сьветлагорскага раёну.

**Валянціне Г.** зь Бешанковіцкага раёну.

**Зьмітру Ж., П.А., Аляксандру Ш.** з Аршанскага раёну.

**Віталю П.** зь Бераставіцкага раёну.

**В.Р.** зь Віцебску.

**Сяргею Д., Аляксандру К., Аляксандру А., Алене М., Сяргею К.** з Горадні.

**Галіне Г.** з Барысаўскага раёну.

**В.П., В.А.** з Магілёва.

**Л.Т., В.В.** з Маладэчанскага раёну.

**Міхаілу Г., Яўгену Б., Аляксандру К., Мікалаю Б., Яніне М., А.П., Віктару А., Ігару Дз.** зь Берасьця.

**Леакадзіі Н.** з Валожынскага раёну.

**Аляксандру П.** з Наваполацку.

**Андрэю К., Уладзімеру А., Аляксандру К.** з Баранавіцкага раёну.

**А.К.** з Дрыбінскага раёну.

**Ганьне Б.** з Рэчыцкага раёну.

**С.Б.** з Ашмянскага раёну.

**Мікалаю К.** з Лунінецкага раёну.

**Ігару С.** з Івянецкага раёну.

**Сяргею І.** з Салігорску.

**П.Г.** з Мастоўскага раёну.

**Юр'ю Г.** са Сьвіслацкага раёну.

**А.К., Надзеі І., Казімеру Г., Сяргею Д., Базылю К., Сьвятлане В., Адаму З., Генадзю К., Юр'ю Б., Валянціне К., А.Г., Ю.Ш., А.Д., Аляксандру Ш., Віктару Г., Віталю С., А., Юр'ю Ш., Надзеі С., Т.В., Васілю Б., Людміле Ш., Марыі І., Людміле І., Настасьсі Т., Галіне Я., Але Дз., Эдварду З., В.М.** зь Менску.


## У продажы засталося 150 асобнікаў

**Найясьнейшая Рэч Паспалітая: Цывілізацыя— Культура— Рэлігія— Палітыка— Авантура— Героіка— Успамін.** — Менск: Логвінаў, 2007.





ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перaказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

## Зьмены на мытні

**Пры канцы мінулага году на беларускай мытні адбыліся прыемныя зьмены.** Працэдура мытнага кантролю вельмі спрасьцілася і стала хутчэйшай. Што ня можа ня радаваць. Раней, праяжджаючы мяжу з машынай, ты павінен быў прайсьці транспартную інспэкцыю, затым — наведваньне да мытнай службы … запоўніць дэклярацыю, дачакацца, пакуль мытнік увядзе яе ў кампутар, раздрукуе пасьведчаньне на ўвоз транспартнага сродку на тэрыторыю Рэспублікі Беларусі, пасьля гэтага надгляд памежнікаў і пашпартны кантроль. Праяжджаючы цяпер беларускую мяжу, ня трэба запаўняць мытную дэклярацыю. Кантроль на мяжы робіцца цяпер хутка, апэратыўна. Засталася транспартная інспэкцыя, мытны кантроль… да цябе сам падыходзіць супрацоўнік у надглядзе аўто (без запаўненьня ўсялякіх папераў) і пашпартны кантроль. Гэта я вам апавядаю аб праезьдзе празь зялёны калідор, калі ты ня маеш для дэкляраваньня адмысловых рэчаў. Дзякуй мытным службам за такія рэвалюцыйныя зьмены для іх, а для нас магчымасьць праехаць мяжу хутка, спакойна і з добрым настроем.

Засмучае іншае. Як вядома, у сувязі з пашырэньнем Шэнгенскай зоны падаражэлі візы. Усе як бы і пагадзіліся з гэтым. Акрамя, здаецца, заяваў В.Гаўла, Л.Валэнсы, А.Квасьнеўскага і стараньняў нашага дэпутата В.Станкевіча.

Калі ў маі 1994 г. уводзіліся візы, цана шматразовай гадавой візы была $2 (для тых, хто мае блізкіх сваякоў). Сёньня гэты кошт складае €150, адмяніліся бясплатныя візы для пэнсіянэраў і для дзяцей ад 7 гадоў. Засталіся 2 бясплатныя наведваньні на год на магілы блізкіх. Я ня супраць кошту за візу. Пакуль яны … непрыемная рэальнасьць для звычайных людзей. Але павінен быць нейкі здаровы сэнс пры ўсталяваньні такіх коштаў. Цяпер даводзіцца задумацца вельмі моцна, наведваючы сваіх бацькоў або запрашаючы іх да сябе. Ня будзем забывацца пра кошт страхоўкі. Для людзей пэнсійнага веку ён, кошт, шчыра кажучы, драконаўскі.

Ходзяць чуткі пра павелічэньне памежнай зоны да 150 км. Тады Вільня ўвойдзе ў гэтую зону і шмат для каго праблема кошту візаў палягчэе. Але гэта пакуль чуткі. Рэальных крокаў ані зь літоўскага боку, ані зь беларускага не чуваць. Можа, варта ў працяг «Эўрапейскага маршу» аб'яднаць разам свае намаганьні беларускім дэмакратам і жыхарам Літвы, паспрабаваць разам дамагацца людзкіх коштаў ня толькі на шматразовыя візы ў Літву, але й шэнгенскіх візаў увогуле.

**Людвіка Кардзіс, Вільня**

## Няхай будуць і спадар, і пан

**Што супольнага паміж беларусам з мабільнікам ля вуха і кудлатым дзецюком, які калісьці ганяўся за мамантамі там, дзе цяпер стаяць лядовыя палацы?** Як тыя нэандэртальцы, шмат хто з нашых суайчыньнікаў зьвяртаюцца адно да аднаго паводле назвы полу — «мужчына» ці «жанчына». Амэрыканскі псыхоляг Lillian Glass у кнізе «Я чытаю вашыя думкі» ўзгадвае лекара, які выказваў пагарду падначаленым мэдсёстрам, называючы іх дзяўчатамі. У нас жа на гэты «ласкавы» зварот вымушаныя адгукацца ня толькі пятнаццацігадовыя, але і сівыя прадавачкі, а «блатныя» выклікі можна пачуць нават ад рахманага працаўніка.

Ангельшчына. У XI—XIII стагодзьдзях ангельская мова лічылася мужыцкай. Заваёўнікі-нарманы навязалі тамтэйшай арыстакратыі французскі зваротак «sir». Ангельцы засвоілі «sir» — і ўжо гэта слова выклікае асацыяцыі хутчэй з сабакам Баскервіляў, чымся з французамі. Дык і нам ня варта зьвязваць гістарычныя крыўды з формай звароту «пан», што блізкая і галяндцу-пратэстанту (van) і басьнійцу-мусульманіну (ban), і ўкраінцу-праваслаўнаму. Аджа сам Багдановіч да трохгодзьдзя «Нашай Нівы» напісаў: «Віншую ад душы, панове…» Калі чалавек адчувае шчырую павагу да сябе, ён без іроніі ўспрымае ўсялякі ветлы эпітэт. Але для расейскамоўнага беларуса менавіта зваротак можа стаць першым словам, якое ён сьвядома вымавіць па-беларуску — няхай яму будзе з чаго выбіраць.

**Сяргей Баранаў, Гомель**

## Зайздрошчу маладэчанцам!

**Ліст Сяргея Космача з Маладэчна «Гонар за горад, дзе жыву» («НН» №42'2007) чытаў і радаваўся: ёсьць жа мясьціны ў Беларусі, дзе людзі — а разам зь імі і ўлады — у свой час скасавалі савецка-камуністычныя назвы вуліц і плошчаў і назвалі іх у гонар знакамітых землякоў, нацыянальных герояў.** Добры ўрок усім нашым малым і вялікім гарадам. Добры ўрок і Слуцку, які летась адзначыў свае 860-ыя ўгодкі.

У Слуцку пашанцавала толькі тром магістральным вуліцам, дзякуючы высілкам тагачаснага старшыні гарвыканкаму. Вуліцы Ўрыцкага вярнулі старадаўнюю назву Капыльская, а Валадарскую перайназвалі ў вуліцу Максіма Багдановіча, бо на гэтай вуліцы ў канцы XVIII ст. знаходзілася фабрыка па вырабе славутых слуцкіх залатых паясоў. Вуліцы Карла Лібкнэхта, нямецкага камуніста, вярнулі дарэвалюцыйную назву — Віленская. На тым і спыніліся.

Бязь зьмены засталіся Акцябрская, Наябрская, Камсамольская, Савецкая, Леніна. Праўда, у 1980-я, з рэкамэндацыі пісьменьнікаў Случчыны (а яна на іх багатая), зьявіліся вуліцы Кузьмы Чорнага, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Антося Алешкі. Але ж яшчэ засталося столькі вартых імёнаў: Алесь Вечар, Юрка Гаўрук, Язэп Дыла, Сьцяпан Ліхадзіеўскі, Мікола Лобан, Альгерд Абуховіч, Алесь Кулакоўскі, Рыгор Крушына, Янка Золак, Уладзімер Клішэвіч. А хіба не заслужылі таго, каб іхнымі імёнамі назвалі вуліцы гораду, арганізатары Слуцкага збройнага чыну 1920-га году — Васіль Русак, Юрка Лістапад, якія загінулі ў ГУЛАГу?

Нязьменнымі застаюцца назвы-парадоксы Слуцку: вуліцы Кутузава, Суворава, Нахімава, Хмяльніцкага, Калініна, Кірава, Чкалава. Зьявіліся ў новых мікрараёнах вуліцы Пугачова, Ржаная (па-беларуску трэ было б «Жытнёвая»), Серпухаўская (горад Серпухаў стаў пабрацімам Слуцку). Так і адчуваецца ва ўсім гэтым паклон «старэйшаму брату» на ўсходзе.

У тапанімічным тупіку апынуліся і жыхары вуліцы 1 жніўня. Ніхто з жыхароў гэтае вуліцы ня ведае, што такое здарылася ў гэты дзень...

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

## Конкурс эсэ для старшаклясьнікаў «Абяры сваю будучыню» — 2008

**Вышэйшая школа камэрцыі і права імя Лазарскага ў Варшаве, ВШЛ (Wyzszą Szkolą Handlu i Prawa im. Ryszarda Lazarskiego, WSHiP; Lazarski School of Commerce and Law, LSC) праводзіць конкурс эсэ для вучняў.** У конкурсе могуць браць удзел вучні старэйшых клясаў агульнаадукацыйных школаў, ліцэяў, гімназіяў і іншых навучальных установаў, што даюць поўную сярэднюю адукацыю, у тым ліку зь Беларусі.

Сёлета Лазарскі прапануе ўдзельнікам конкурсу паразважаць над вельмі важнай і цікавай грамадзкай зьявай — фармаваньнем грамадзкай думкі.

Ад вучняў зь Беларусі да ўдзелу ў конкурсе прымаюцца эсэ на беларускай, ангельскай ці польскай мовах. Вучні 11-х клясаў, зацікаўленыя ў атрыманьні зьніжкі на англамоўную адукацыю ў LSC, павінныя пісаць эсэ па-ангельску. Ацэньвацца будзе выключна зьмест эсэ, таму выбар мовы з прапанаваных да ўдзелу ў конкурсе ня будзе ніякім чынам уплываць на выніκі конкурсу. Пераможцы конкурсу атрымаюць узнагароды, у тым ліку права на зьніжку аплаты для навучаньня ў ВШЛ.

Падрабязная абвестка, дадатковая інфармацыя і прыклад эсэ мінулага году: http://svetlahorsk.belarda. org/info/abviestki

**Тэрмін прыёму працаў: да 10 сакавіка 2008.**

## Календароў яшчэ няма, але цукеркі ўжо ёсьць

**Мяне родныя з Пскова папрасілі прывезьці ім у падарунак насьценны ка-**

**ляндар зь беларускімі краявідамі, і каб назвы месяцаў і дзён тыдня былі па-беларуску.** І што ж, давялося зманіць ім, што ў мітусьні забыўся на іхную просьбу. Мне было сорамна прызнацца, што ў Беларусі не выпускаюць беларускіх календароў! На самой справе я ўвесь сьнежань амаль штодня заходзіў у «Цэнтральную кнігарню» ў пошуках календара. Там усе сьцены завешаныя календарамі зь беларускай тэматыкай, але ўсе выкананыя па-расейску і па-ангельску. Чаму б хаця частку накладу ня выдаць па-беларуску і па-ангельску?

У мінулым годзе наша «Камунарка» не без дапамогі той жа Расеі вымушаная была зноўку ўспамінаць родную мову. І цяпер усе цукеркі маюць абгорткі на дзьвюх дзяржаўных мовах. І калі, напрыклад, раней цукеркі «Красная Шапочка» перакладалі на беларускую «Чырвоная Шапачка», то цяпер сталі пісаць, як і трэба — «Чырвоны Каптурок». Брава!

**Лявон Гуменьнікаў, Менск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.
e-mail: nn@nn.by.
Факс: (017) 284-73-29**

## пытайцеся ў распаўсюднікаў новы нумар




ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 00345

# Міхалевіч падаў у суд на «Советскую Белоруссию»

Намесьнік старшыні Партыі БНФ Алесь Міхалевіч зьвярнуўся ў суд Савецкага раёну Менску з пазовам да газэты «Советская Белоруссия». Палітык абурыўся нядаўнім артыкулам «СБ» Арцёма Чалядзінскага «Крутой мираж». Там пісалася наступнае: «Яны (індывідуальныя прадпрымальнікі — ЗП), у большасьці сваёй простыя і добрыя людзі, якія не дасьведчаныя ў тым, што ў нас называецца тонкім словам «палітыка». Таму яны шчыра думаюць, што Міхалевіч—Мілінкевіч, якія ў жыцьці ня вырасьцілі і тым больш не прадалі ніводнага вядра бульбы, рэальна дапамогуць ім у спэцыфічных прадпрымальніцкіх праблемах».


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

«На лецішчы маёй цешчы ў Крыжоўцы, як і ўсе беларусы, мы штогод саджаем бульбу. Я, як самы малады мужчына ў сям'і, бяру ўдзел у справе вырошчваньня бульбы таксама пастаянна, таму мяне і абражаюць словы, што я ня вырасьціў ніводнага вядра бульбы», — кажа А. Міхалевіч.

Ён зьбіраецца дамагацца таго, каб «Советская Белоруссия» надрукавала абвяржэньне гэтай інфармацыі на другой паласе, а таксама сплаціла маральную кампэнсацыю ў памеры 6160 рублёў — столькі каштуе пустое вядро для бульбы ў ГУМе.

«Думаю, што перамагчы ў судзе абсалютна рэальна з гледзішча фармальнага заканадаўства, але паглядзім, што скажа суд», — кажа Міхалевіч.

**Зьміцер Панкавец**

# І нашым і вашым

22 студзеня Рада Эўропы заслухала дакладчыка ў справае Беларусі.


PHOTO.BYMEDIA.NET

22 студзеня ў Страсбургу прайшло паседжаньне Палітычнага камітэту ПАРЭ па Беларусі. Даклад па Беларусі падрыхтаваў італьянскі парлямэнтар Андрэа Рыгоні — спэцыяльны дакладчык у справах Беларусі. Ён прыяжджаў у Менск летась у кастрычніку.

Ад Беларусі ў Страсбург запрасілі дзьве дэлегацыі. Афіцыйныя ўлады прадстаўляюць сябры Нацыянальнага сходу Натальля Андрэйчык і Аляксандар Архіпаў, апазыцыю — Вінцук Вячорка і Віктар Карняенка.

Палітоляг Аляксандар Лагвінец лічыць паседжаньне ў Страсбургу выразнай прыкметай таго, што ў Эўропе дагэтуль існуе цікавасьць да Беларусі: «Робяцца самыя розныя спробы хоць неяк урэгуляваць беларускае пытаньне. Зразумела, што і ўлада жадае тут весьці сваю гульню, паколькі яна хоча легітымізаваць свой так званы заканадаўчы орган міжнароднай супольнасьцю. Калі казаць пра зьмест дакладу спадара Рыгоні, дык той зьмест, зь якім я азнаёміўся, можна назваць даволі стрыманым. Канечне, у ім указваецца на пэўныя парушэньні правоў чалавека, хаця нават з дэклярацыяў спадара Рыгоні бачна, што ён хоча займець сабе, як і шмат хто зь іншых папярэдніх перамоўшчыкаў, ляўры чалавека, які знайшоў вырашэньне беларускага пытаньня. Хаця яно не такое ўжо і простае».

**ЗП; радыё «Свабода»**

# Калякін стварыў «Гарызанталь»

Аб'яўлена аб стварэньні сацыяльна-патрыятычнага грамадзкага аб'яднаньня «Гарызанталь». Устаноўчы сход новай арганізацыі адбыўся 20 студзеня ў Менску. У працы сходу ўзялі ўдзел 85 дэлегатаў.

Мэтамі стварэньня аб'яднаньня, згодна з прынятым статутам, вызначаныя: дапамога ў разьвіцьці грамадзянскай супольнасьці Рэспублікі Беларусь; падтрымка грамадзянскіх ініцыятываў, скіраваных на рэалізацыю прынцыпаў патрыятызму, сацыяльнай справядлівасьці, роўнасьці, народаўладзьдзя, умацаваньня і разьвіцьця патрыятычных і дэмакратычных традыцыяў і дасягненьняў беларускага народу.

Устаноўчы сход абраў раду «Гарызанталі» ў колькасьці 13 чалавек. У яе склад увайшлі Сяргей Калякін (старшыня савету), Аляксандар Бухвостаў, Аляксей Елісееў, Алена Скрыган, Валеры Ўхналёў, Сяргей Вазьняк.

**ЗП**

## СЬЦІСЛА

### Вэтэранам і аўганцам вярнулі льготы на праезд

Гэта адбылося дзякуючы міжурадаваму пагадненьню, якое ў 1993 годзе ў Маскве падпісаў Вячаслаў Кебіч. Пагадненьне аказалася больш значным за закон аб ільготах, і цяпер вэтэранам і «аўганцам» ізноў можна езьдзіць бясплатна на гарадзкім, прыгарадным і нават чыгуначным транспарце.

### Пракуратура мае прэтэнзіі да «Газеты Слонімскай»

Галоўны рэдактар недзяржаўнага выданьня «Газета Слонімская» Віктар Валадашчук даў тлумачэньні ў міжраённай пракуратуры з факту некалькіх публікацыяў. Нагодай для гэтага сталі прэтэнзіі да газэты з боку абласнога ўпраўленьня юстыцыі. У прыватнасьці, некалькі матэрыялаў з залі суду былі апублікаваныя раней, чым рашэньне суду ўвайшло ў законную сілу. Яшчэ прэтэнзіі выклікала інтэрвію з прадстаўніцай аддзяленьня Саюзу палякаў у Слоніме, дзе згадваліся назвы палітычных партыяў і рухаў, нібыта не зарэгістраваных на тэрыторыі Беларусі. Віктар Валадашчук усе прэтэнзіі называе надуманымі. «Газета Слонімская» — апошняе незалежнае выданьне ў Гарадзенскай вобласьці.

**ЗП**

Вадохрышча ў вайсковай частцы.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Абрабавалі Сынкавіцкую царкву

Зэльвенская міліцыя адпрацоўвае розныя вэрсіі здарэньня. Цікава, што злодзей скраў толькі два пярсьцёнкі, пакінутыя прыхаджанамі ў знак падзякі цудадзейнаму абразу Божай Маці. Побач ляжалі іншыя ўпрыгожаньні, аднак яны засталіся некранутымі. А вось грошы з ахвяравальных скрыняў зьніклі да капейчыны, а там было каля мільёна рублёў.

## Былы кіраўнік ДАІ Беларусі атрымаў ордэн Сталіна

Кіраўнік віцебскай міліцыі палкоўнік Леанід Фармагей атрымаў ад Усебеларускага аб’яднаньня казацтва ордэн Сталіна. Яго ўзнагародзілі «за бездакорную службу ў праваахоўных органах, асабісты ўнёсак у ахову правапарадку ды ў гонар 70-годзьдзя ўтварэньня Віцебскай вобласьці». Паводле некаторых зьвестак, першыя два ордэны Сталіна ў Беларусі атрымалі дзяржсакратар Рады Бяспекі Віктар Шэйман і палкоўнік Дзьмітры Паўлічэнка.

## Згарэлі 190 парсючкоў

190 парсючкоў згарэлі ў пажары, які ўсчаўся ў адным з будынкаў сьвінакомплексу ў вёсцы Лядкі (Мастоўскі раён). Вартаўнік заўважыў пажар, калі ўвайсьці ўсярэдзіну было ўжо немагчыма. Хоць ратавальнікі прыбылі праз 13 хвілін пасьля выкліку, страха да таго часу абвалілася.

## Цягнік раструшчыў «Форд»

Жыхарка Жабінкі на чыгуначным пераезьдзе хацела праскочыць на чырвонае сьвятло, але аўто заглухла. Жанчына пасьпела выскачыць, а машыну працягнула па рэйках некалькі кілямэтраў. «Форд» пасьля такога ператварыўся ў мэталалом. А нядбайна1 кіроўцу давядзецца заплаціць за пашкоджаны электравоз і кампэнсаваць выдаткі чыгункі за парушэньне графіку руху транспарту.

## Магілёў—Вільня

Ад 15 лютага з Магілёва будзе курсіраваць просты цягнік на Вільню. Самы танны білет у агульны вагон каштуе каля 25 тыс. рублёў, самы дарагі ў купэ — прыкладна 55 тысячаў.

## Хамутоўскі падпісаў кантракт з «Карл Цайс»

Хамутоўскі колісь пасьпяхова выступаў за бухарэсцкі «Сьцяўа», але потым перабраўся ў расейскую «Томь», дзе меў няшмат гульнявой практыкі. Цяпер 29-гадовы галкіпэр беларускай зборнай будзе выступаць за клюб другой нямецкай бундэсьлігі «Карл Цайс». Енскі клюб няўдала выступае ў гэтым першынстве і займае пасьля першага кругу перадапошняе 17-е месца.

## Памёр легендарны шахматыст Бобі Фішар

У Ісьляндыі на 65-м годзе жыцьця памёр былы чэмпіён сьвету па шахматах Бобі Фішар. Ён нарадзіўся 9 сакавіка 1943 г. у Чыкага. За шахматную дошку сеў у шэсьць гадоў. А ўжо ў 13 гадоў перамог на юнацкім чэмпіянаце ЗША, стаўшы самым маладым чэмпіёнам краіны па шахматах. У 1972 г. Фішар адваяваў у Спаскага тытул чэмпіёна сьвету. Ён быў адзіным амэрыканцам па паходжаньні — уладальнікам гэтага тытулу.

**ЗП, Ул.інф., БелТА, СТВ, BulletinOnline.org, «Звязда», BBC, Эўрарадыё, радыё «Свабода»**

# Песьні гандальераў з Старых Дарог



## Спэктакль для вясёлай швэдзкай сям'і

«Купалаўцам» спатрэбіўся швэдзкі рэжысэр, каб давесьці скептыкам: урокі сцэнічнай плястыкі яны яшчэ не забылі. На сцэне рухаліся і акторы, і дэкарацыі, так што не заўжды вочы пасьпявалі за імі. Піша **Аляксандар Фядута**.

Дваццатага студзеня ў Купалаўскім мусіў ісьці «Макбэт». Але паколькі жах ад нявыказанай услых пагрозы «пераперці Шэксьпіра на мову родных асінаў» з расейскай, верагодна, уласьцівы ня толькі мне, ці проста нехта зь вядучых актораў захварэў, Шэксьпіра замянілі «перапёртым» усё ж Карла Гальдоні: ішоў «Слуга двух гаспадароў», пастаўлены швэдзкім гастралёрам Аляксандрам Нордштрэмам.

Сцэнаграфія Валянціны Праўдзінай была нашмат ляканічнейшай за сцэнаграфію маэстра Барыса Герлавана ў «Ромуле Вялікім», якога мы глядзелі ў мінулы раз. Дух слаўнай Венецыі перадавалі гарбатыя мосьцікі розных памераў, што сваімі абрысамі нагадвалі каптуркі Арлекіна з камэдыі дэль артэ, якая, уласна кажучы, і стала асновай творчасьці Гальдоні. Аналягічныя «каптуркі-мосьцікі» чайкамі віселі ў паветры, імітуючы то падсьвечнікі, то, імаверна, аблокі, у залежнасьці ад таго, дзе адбывалася дзея: у памяшканьні ці на вуліцах гораду сьвятога Марка.

Такой жа ляканічнай была і музыка народнага артыста Беларусі Сяргея Картэса. Памятаючы, мабыць, што надта шмат нотаў чалавечае вуха (гл. фільм Мілаша Формана «Амадэй») успрыняць ня можа, спадар Картэс рэзка скараціў колькасьць музыкаў, сабраўшы зь пяці чалавек такі сабе «надзейны маленькі аркестрык» і апрануўшы іх у сучасныя Гальдоні строі. Сам кампазытар перад спэктаклем таксама мільгануў у аркестравай лёжы (ня ў яме, а менавіта ў лёжы: музыкі ж таксама людзі!).

А вось цяпер можна пераходзіць і да рэжысуры.

Аляксандар Нордштрэм цалкам зрэалізаваў ідэю жартаўніка Труфальдзіна — дакладней, даручыў ягоную ролю чатыром акторам АДНАЧАСОВА.

І гэта выратавала спэктакль.

Калі ставіцца бэнэфісная п'еса, у якой ёсьць яскравы галоўны герой — а п'еса Гальдоні менавіта такая, — глядач і ходзіць на выканаўцу гэтай самай галоўнай ролі. Любога выканаўцу ролі Труфальдзіна постсавецкі глядач вымушана параўноўвае з Канстанцінам Райкіным. А тут адначасова — часам па адным, але ўсё адно засеўшы ў памяці гледача як адна чвэрць паяднанага «труфальдзінавага» калектыву — на сцэне знаходзяцца чацьвера маладных і завадных хлопцаў. Яны, нібыта, і аднолькавыя — у сваіх касьцюмах, масках, нацягнутых на твары, і — розныя. І яны ўвесь час рухаюцца, як быццам Нордштрэм прывёз ім ад Карлсана са Стакгольму маторчыкі і ўставіў, гм-гм, у патрэбнае месца.

І гэты ж прыём рэжысэр выкарыстаў у дачыненьні да Смэральдзіны: сапраўды, за што ж «пазбаўляць» некага з чатырох «слугаў двух гаспадароў» сяброўкі? У выніку два вялікія маладыя квартэты — Труфальдзіна (Дзьмітры Ясяневіч, Раман Падаляка, Ігар Пятроў, Сяргей Чуб) і Смэральдзіна (Сьвятлана Анікей, Валянціна Гарцуева, Яўгенія Кульбачная і Вольга Няфёдава) прымусілі залю сапраўды сьмяяцца. Чаго вартая, скажам, цудоўная сцэна, у якой усе чатыры выканаўцы ролі Смэральдзіны тлумачаць Сыльвіё (Аляксандар Паўлаў), які праштрафаваўся, што ён, разумееце, ня мае рацыі, калі ня верыць закаханай у яго Клярычэ (Кацярына Яворская). І адзін лямант разьюшанай служкі было б цяжка вытрываць, а тут — чатыры!

Нордштрэм апынуўся патрабавальным і строгім — але адначасова і ўдзячным пастаноўшчыкам. З аднаго боку, ён прымусіў амаль усіх актораў, што выходзілі

на сцэну, рабіць самыя неймаверныя кульбіты. Ну, з Труфальдзіна ўсё зразумела — усе чацьвера перакульваліся, як маглі. Але і камічныя старыя — Панталёнэ (Мікола Кірычэнка), Доктар (Віктар Манаеў) і Брыгела (Уладзімер Рагаўцоў) — ні ў чым не саступалі моладзі: перакульваньняў, праўда, у іх не было, але яны і бегалі, і дэкарацыі на сабе цягалі. Аказваецца, «купалаўцы» ўмеюць рухацца, а ня толькі слупам стаяць! Аказваецца, яны жывыя, а зусім ня трупа, што складаецца з застылых воскавых знакамітасьцяў!

І пастаноўшчык даў кожнаму магчымасьць пагарэзьнічаць ад душы і атрымаць сваю — асабістую! — частку заслужаных апляньдысмэнтаў. Панталёнэ, што трасе бухгальтарскім абакам, акампануючы рамансу Бэатрычэ (Юлія Шпілеўская); Брыгела, што абвяшчае па мабільным тэлефоне пра тое, што Труфальдзіна ў вышуку, нарэшце, Доктар, які ў прыпадку справядлівай разьюшанасьці такім сабе кураняткам-энтузіястам насаджвае сябе на забойчы ражон-шпагу, спрабуючы давесьці свайму апанэнту ягоную няслушнасьць, былі бліскучымі. Выбітная таксама сцэна, у якой Панталёнэ спрабуе скласьці мэню да вясельля: гаспадар гатэлю Брыгела навязвае яму і морапрадукты цаною пяцьдзясят тысячаў, і гарэлку са Старых Дарог цаною семдзесят тысячаў, і нешта там яшчэ з рэпэртуару менскага харчаваньня і за тую ж неймаверную менскую цану. Што з гэтага прыдумка рэжысэра, што — саміх актораў, а што – проста імправізацыя, уласьцівая жанру, ня так ужо і істотна: посьпех — заслуга супольная.

Але ў цэнтры камэдыі Гальдоні, як мы памятаем, усё ж тры закаханыя пары. Квартэты Труфальдзіна і Смэральдзіны прааналізаваць цяжка: не зусім зразумела, чым кіраваўся рэжысэр, падбіраючы менавіта тыя, а ня іншыя камбінацыі з таго match: разнафактурнага чалавечага матэрыялу, што ў яго быў. Але ў любым выпадку, кожны з удзельнікаў гэтага квартэту быў забаўным, раскутым і граў сапраўдную камэдыю. А вось пары рамантычна закаханых былі далёка не раўназначнымі. Калі Сыльвіё і Клярычэ былі, на наш погляд, вельмі добрымі, то, прымусіўшы Бэатрычэ імітаваць недарэчны ў Італіі ангельскі акцэнт, рэжысэр папросту зрабіў палову яе рэплік малазразумелымі для гледачоў: паспрабуйце на вялікай хуткасьці размаўляць па-беларуску з ангельскім акцэнтам, і вы зразумееце, што спадарыню Шпілеўскую паставілі ў надта нязручную сытуацыю. І гэта пры тым, што сцэнічнае маўленьне ў сёньняшняга пакаленьня «купалаўцаў» — наагул слабое месца.

І ў цэлым Бэатрычэ не пашанцавала. Палымяная закаханая дзяўчына, пераапранутая ў мужчынскі касьцюм, чамусьці зьяўляецца на сцэне зь бізуном у руках (відавочны эратычны намёк). І калі б не закаханы ў яе Флярында (Павал Яскевіч выдатна сыграў такога брутальнага героя-каханка, які, пабачыўшы каханую, запальваўся і цягнуў яе за кулісы), і ня сьціплыя спробы яе скочыць з таго самага гарбатага мосьціка, даведаўшыся пра сьмерць каханага (дасьціпнае рашэньне рэжысэра, цалкам натуральнае для Венецыі, дзе тых мастоў!..), мы б ніколі не зразумелі, што гераіня Юліі Шпілеўскай — нармалёвая жанчына, а ня сэкс-дамінатар з порнасайту.

У цэлым, выйшла цудоўная сямейная камэдыя ў швэдзкім варыянце: дзяцей можна вадзіць на яе, і ўсе атрымаюць сваю порцыю асалоды — праўда, у некаторых месцах ня варта акцэнтаваць увагу маладога пакаленьня на некаторай двухсэнсоўнасьці «купалаўскай» інтэрпрэтацыі італьянскай камэдыі. Нічога страшнага ў гэтым няма: падрастуць — зразумеюць!

Толькі адзначым яшчэ дзьве акалічнасьці. Па-першае, цудоўныя касьцюмы і абутак, прадуманыя і добра пашытыя (а, можа быць, проста новыя, і таму яны так уражваюць?). Па-другое, поўная адсутнасьць кветак у зале, што, падобна да таго, стала сыстэмай: глядач не шкадуе авацыяў, але чамусьці ходзіць у тэатар бяз кветак. Шкада: дзякаваць гэтым разам было за што.

А перакладаць Гальдоні ўсё ж такі трэба з італьянскай.

**Аляксандар Фядута, глядач**


зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»



**Артур Клінаў. Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца.** Раман



**Ева Вежнавец. Шлях дробнай сволачы.** Апавяданьні



**Валянцін Тарас. На высьпе ўспамінаў.** Мэмуары

шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў

# Франак Вячорка: Дубляж «Шрэка»

Учора старшыня культурніцкай камісіі Партыі БНФ **Франак Вячорка** быў затрыманы ў пастарунку, куды прыехаў падтрымаць затрыманых сяброў. А сёньня судзьдзя ўляпіла яму 15 сутак за «нецэнзурную лаянку». Напярэдадні затрыманьня ён акурат пагутарыў з карэспандэнткай «НН» — пра папугаяў, якія размаўляюць па-беларуску, пра місію чалавека на гэтым сьвеце, пра «Белсат» і аўдыёбізнэс. А таксама пра затрыманьні.



**Франак Вячорка з бацькам у судзе 17 студзеня.**

WWW.SVABODA.ORG

## «У дзяцінстве было цяжка»

**«НН»: Сп. Франак, наша сустрэча адбываецца на сядзібе БНФ. Не магу не задаць Вам пытаньне, якое мяне даўно цікавіць. Чаму над офісам БНФ бел-чырвона-белы сьцяг то ёсьць, то няма? Калі ангельская каралева прысутнічае ў сваім замку, над ім узьнімаюць нацыянальны сьцяг. Вы такім чынам, можа, адзначаеце наяўнасьць ці адсутнасьць у сядзібе кіраўніка Фронту?**

**Франак Вячорка:** (сьмяецца) Сьцяг ёсьць заўсёды. Нейкія пачвары шкодзяць трымальнікі, на якіх ён мацуецца, пакуль наладзім — няма на што павесіць. Нядаўна у міліцыю зьвярталіся.

**«НН»: Да Вашых стасункаў зь міліцыяй мы вернемся пазьней, а пакуль я папрасіла б Вас, дзеля знаёмства, распавесьці трошкі пра Вашу сям'ю. Вы — сын актыўных грамадзкіх дзеячаў Арыны ды Вінцука Вячоркаў. Скажыце, калі ласка, як Вы адчуваеце сябе ў гэтай сям'і як сын? Што далі або, можа, не далі Вам бацькі? Чаму Вы ад іх навучыліся?**

**ФВ:** Я ганаруся сваімі бацькамі, як ніхто. Ад маленства гадаваўся ў асяродку выдатных людзей. Анатоль Сыс вучыў пісаць вершы, Новік-Пяюн расказваў казкі. Мама займалася рыцарскімі клюбамі, а таму ўсё дзяцінства штурмаваў замкі ў Лошыцы, махаў мячом на турнірах, езьдзіў па Беларусі пад музыку «Камэлёту». Тата прышчапіў цікавасьць да палітыкі і моваўзнаўства. Я шчасьлівы праз гэта. Мяне дакараюць: маўляў, вядома, чый ты сын! Не памыляюцца. Вялікая заслуга маіх зьдзясьненьняў належыць менавіта бацькам, якія выхавалі і навучылі жыць ды перамагаць.

**«НН»: Па горадзе ходзіць пагалоска, што ў Вашай сям'і нават папугай гаворыў па-беларуску?**

**ФВ:** Так, яго звалі Дзюба, а дакладней — Дзюба — добрая птушачка. Птушкі, марскія сьвінкі, каты, пацукі, хамякі ажыўлялі жыцьцё нашай сям'і, і без таго бурлівае.

**«НН»: Ці не было ў Вас у дзяцінстве такога адчуваньня, што Вашая сям'я не такая, як усе? Ці адбівалася грамадзкая дзейнасьць бацькоў на Вашым дзіцячым самаадчуваньні?**

**ФВ:** Адбівалася. Дзяцінства было цяжкое, але нядоўгае. Кожнае дзіцё падсьвядома імкнецца быць як усе, каб на яго не паказвалі пальцам... Малым я часта перажываў праз ўсякія палітычныя пэртурбацыі. Памятаю «Чарнобыльскі шлях», калі пераварочвалі машыны, я, зусім малалетні, ішоў у першых шэрагах, мне было тады гадоў восем—дзевяць... Памятаю, як на бацьку завялі крымінальную справу, і яго галадоўку... Першыя стасункі зь міліцыяй — ва ўзросьце 12-і, а затрымлівалі ўвогуле разоў 30—35. Але тут няма чым ганарыцца.

**«НН»: Можа, Вы ўжо прызвычаіліся да затрыманьняў ці да гэтага немагчыма прызвычаіцца?**

**ФВ:** Прызвычаіўся, але не зьмірыўся. Мірыцца з гэтым я ня буду. Напрыклад, у савецкім РУУСе я госьць чаканы. Няхай сабе. Знаёмствы зь міліцыянтамі дазваляюць зразумець іх, размаўляць зь імі, а значыць, і ўзьдзейнічаць на іх. Зь міліцыянтамі — не з амапаўцамі — можна і трэба паразумецца.

**«НН»: А з амапаўцамі — не?**

**ФВ:** З амапаўцамі — не. Паводзяць яны сябе па-зьверску. Валянцін Мазец, які выкладаў у часьці Паўлічэнкі, расказваў, што ў большыні спэцназаўцаў няма сем'яў, ім забараняецца чытаць газэты, ад таго адсутнічае асабістае мерканьне. Калі нас з Хведаруком, Калітом бралі ў Салігорску падчас суду над Шылам, пераканаўся ў страчанасьці гэтых асобаў... Язык не паварочваецца называць гэтых чарнасоценцаў беларусамі.

**Франак Вячорка**

вядомы многім як ініцыятар беларускіх культурніцкіх і грамадзкіх праектаў: то, чутно, каманда пад ягоным кіраўніцтвам агучыла па-беларуску культавы галівудзкі фільм альбо папулярны мульцік, то зладзіла акцыю-пэрформанс... Апошнім часам сп. Франак займаецца аўдыёкнігамі. А яшчэ Франак Вячорка — кіназорка, галоўны герой фільму польскага рэжысэра Міраслава Дэмбіньскага «Урокі беларускай мовы». Яму 19 год, ён студэнт БДУ, і яго 35 разоў затрымлівала міліцыя.

# важнейшы за 35 затрыманьняў

## «Дзядуля — сымбаль працавітага і адказнага чалавека»

**ФВ:** Бабуля Аля — маці таты — дарагі мне чалавек, пасьлядоўна выпісвае «Нашу Ніву». Вельмі любіў дзеда Рыгора. Летась ён памёр. Адказны, мудры, працаваў сумленна і рупліва. Радзіў Машэраву ў эканамічных пытаньнях, замяшчаў кіраўнікоў Дзяржпляну. Толькі ўявіце. Плянавая эканоміка. Ніякай нябачнай рукі рынку няма. Усе цэны, разьлікі, прагнозы, фінансавыя абароты вызначаюцца групай інтэлектуалаў зь Дзяржпляну. Памылка — капец. Гэтыя асобы — героі, — здабывалі свавім потам які-ніякі дабрабыт.

## «Да беларускасьці людзі далучаюцца праз культуру»

**«НН»: У чым Вы бачыце сваё прызначэньне?**

**ФВ:** Кожны чалавек у жыцьці мае нейкую місію. Яна можа быць пэўнай і абстрактнай. Я пачаў нешта такое ўсьведамляць у Ліцэі. Мне прышчапілі адказнасьць, сыстэмнасьць, упартасьць, а ў якасьці пачынкі — веды. Я не паехаў вучыцца за мяжу, як бальшыня аднагрупнікаў. Як мы зьбіраемся нешта зьмяняць у краіне, няшчадна пасылаючы моладзь за мяжу?! Трэба быць тут і кропка.

Мне 19. Шукаю сябе. Маю на гэта час. Троху займаюся мовазнаўствам, публікаваўся ў «Родным слове», нятроху — палітыкай — але так, ціха-ціха. Трэба ж неяк давучыцца ва ўнівэрсытэце. Калі скончу — тады дам жару. Мяне шмат што не задавальняе, і я не з шарагоўцаў.

Перамагаць трэба ў культуры. У культуры шлях да свабоды. Дубляж «Шрэка» на беларускую альбо аўдыёкніга Міколы Ермаловіча ня менш важныя за «Эўрапейскі» або «Сацыяльны» маршы. Марш прайшоў, пра яго забылі, а фільм, аўдыётрэкі застануцца ў Сеціве, і будуць аўтаномна функцыянаваць, прыцягваць новых людзей да беларушчыны. Прайшло паўтара году ад дубляваньня другога Шрэка, а мне й сёньня пішуць шчасьлівыя людзі, якія знайшлі ў сетцы пераклад, у захапленьні і жадаюць дапамагчы... Людзі паверацць нашым палітыкам тады, калі ўбачаць у іх культурніцкую альтэрнатыву.

**«НН»: Што Вы лічыце сваімі самымі яркімі посьпехамі і ўдачамі?**

**ФВ:** Складанае пытаньне... Толькі посьпехі. Вялікая перамога — захаваньне Ліцэю.. Ня спалі ночы, друкавалі ўлёткі, ладзілі акцыі і зьбіралі подпісы. Як вынік, Ліцэй існуе, дарэчы, шукае абітурыентаў. Я ўсё яшчэ веру, што менавіта ліцэісты будуць ствараць новую Беларусь. Дарэчы, як заўважыў Аляксей Крукоўскі, нават апошні зьезд Партыі БНФ паказаў, наколькі грамадзкае жыцьцё завязана вакол Ліцэю: ліцэйскаму выкладніку супрацьстаяў выпускнік, але перамогу ўзяў намесьнік дырэктара.

Яшчэ посьпехі — паседжаньні камісіі па культуры, генэратары крэатыўных ідэяў ды ініцыятываў. Стартавала брашурка «Наша культура», Паўлам Дзюсекавым падрыхтаваны дыск «Гімны Беларусі», плянуем зрабіць відэаэкскурсіі па менскіх мясьцінах БНР, робім фільм пра батлейку Пана Скіргайлы, Зьміцер Кісель зь Пінску дапамагае ў складаньні моладзевай мультымэдыйнай энцыклапэдыі пра БНР. Неўзабаве будзе надрукавана сэрыя беларускамоўных паштовак да Дня сьвятога Валянціна.

Летась выйшла складанка на вершы Купалы, дыск Сокалава-Воюша. У межах «Беларускага Гальфстрыму» выйшлі ўжо пяць дыскаў з фільмамі, прадубляванымі на беларускую — «Любоў насамрэч», «Шрэк 2», «Крымінальнае чтыво», «Маленькая калядная казка», «Шрэк Трэці». Ня ўсё дублюецца, дубляж дарагі, застаецца на ўзроўні субтытраў ды распаўсюджваецца праз інтэрнэт.

**«НН»: А што з распаўсюдам, дарэчы?**

**ФВ:** Распаўсюд — вялікая праблема. Важна хаця б дайсьці да мэтавай групы ды зьберагчы зробленае. Ня веру ў будучыню кніжнага фармату. Новае пакаленьне забудзе пра традыцыйныя бібліятэкі. Трэба ўсё пераводзіць у лічбу. І вельмі добра, каб усе нашыя фільмы, кніжкі, як бы гэта ні шкодзіла рэнтабэльнасьці, трапілялі ў Сеціва.

Напярэдадні Калядаў выйшла дзясятая аўдыёкніга, зробленая нашай камандай «БелТонМэдыя» — гэта казка Ганса-Хрысьціяна Андэрсэна «Дзікія лебедзі». Чакайце. Будзе ўся школьная праграма!

**«НН»: Аднак адразу ж узьнікае пытаньне: калі разьмяшчэньне ў Сеціве шкодзіць продажам, то як жа тады вяртаць грошы, як працаваць далей?**

**ФВ:** На культуры сёньня не заробіш. Але вось як улада зьменіцца, то гэтыя справы пачнуць прыносіць грошы. І ўсё стане на месца. Усё акупіцца. Усё акупіцца да ліпеня-жніўня 2010 году. Так і трэба працаваць. Цяпер цяжка, затое пасьля ніша будзе нашая. Мы зарэгістравалі фірму «БелТонМэдыя» і будзем змагацца за свой сэгмэнт рынку.

## Папярэджаньне маладым чытачкам «НН»

**«НН»: Ці ёсьць у Вас вольны час?**

**ФВ:** Мала. Але я гэта вырашаю. Шмат часу жарэ вучоба — прыходзіцца зубрыць многа такога, без чаго можна было б абысьціся. Але адукацыя — справа сыстэмная, нікуды не падзенесься. Мой адпачынак — гэта сябры, падарожжы, рамантычныя спатканьні...

**«НН»: Вось наконт рамантычных сустрэч падрабязьней, калі ласка... Яны ў Вас пакуль ня выліліся ў пляны ажаніцца?**

**ФВ:** Жаніцца не зьбіраюся. Але я (задумваецца)... Але я ў пошуку.... Разьбіваю жаночыя сэрцы. Жорсткі і самазакаханы! Як мне нядаўна заявілі...

**«НН»: Вось як! Тады добра, што пра гэта загаварылі: маладыя чытачкі «НН» будуць папярэджаныя.**

## Пытаньне ад маладога чытача «НН»

**«НН»: Якія кнігі Вы параіце браць з сабой на адседку?**

**ФВ:** Найлепшая кніжка для гэтых мэтаў, па якой я цяпер настойліва раю «Белсату» зьняць фільм — гэта «Ў кіпцюрах ГПУ» Аляхновіча. З тых часоў нічога не зьмянілася! Тыя ж думкі, цёмныя лямпачкі, груканьне ў сьцены, страх, няўпэўненасьць. Гэта тое, што бачыш навокал. Яшчэ параю нешта для душы. Я чытаў Мілана Кундэру. Выдатна ідуць «Фрашкі да пляшкі» Севярына Квяткоўскага. Бацька ў турме звычайна працуе, робіць пераклады, піша артыкулы. Але гэта каму як.

## «Белсат» і палякі

**«НН»: Вы загаварылі пра сваю супрацу зь «Белсатам». Якое ў Вас уражаньне ад яе, ад гэтага каналу?**

**ФВ:** Усё яшчэ толькі пачынаецца. Ідэя харошая, правільная. Але канал створаны палякамі, і гэта адчуваецца, хоць там і працуюць пераважна беларусы. У любым разе трэба думаць пра стварэньне сваёй уласнай беларускай тэлевізіі. Пакуль глядзеў толькі праз інтэрнэт, ні я, ні сябры талерак ня маюць, высновы нейкія рабіць цяжка. Але створаная каналам прадукцыя заслугоўвае, натуральна, пахвалы — фільмы, сэрыялы, кінапублiцыстыка. Я зь «Белсатам» ад пачатку, дапамагаў аддзелам перакладаў, графікі, кінапрадукцыі. Цяпер зьбіраю прапановы для пастаноўкі новых фільмаў ды спэктакляў.

**Гутарыла Наталка Бабіна**

## 15 студзеня

### Дапыталі прадпрымальніцу

**Мая Сінайская**, сябра рэспубліканскага аб'яднаньня «Пэрспэктыва», старшыня рады прадпрымальнікаў менскага рынку «Дынама», была выкліканая ва ўправу міліцыі Маскоўскага раёну Менску. Міліцыянты папярэдзілі яе, што ў іх ёсьць «дакумэнтальныя відэаздымкі акцыі пратэсту на Кастрычніцкай плошчы, да якіх патрабуюцца асабістыя тлумачэньні».

### Затрымалі на кватэры

На ўласнай кватэры затрымалі ўдзельніцу прадпрымальніцкай акцыі 10 студзеня актывістку незарэгістраванага «Маладога фронту» **Юлію Сіўцову**. На наступны дзень яе асудзілі на 15 сутак.

## 16 студзеня

### Затрыманьні ў Дзень салідарнасьці

Падчас правядзеньня акцыі салідарнасьці на вуліцы Няміга былі затрыманыя 6 актывістаў грамадзянскай кампаніі «Джынс — за Свабоду». Амапаўцы прыбылі на месца акцыі праз 10 хвілінаў пасьля яе пачатку. Яны вырывалі з рук удзельнікаў партрэты палітвязьняў. Былі затрыманыя — **Вольга Гулякевіч**, **Максім Вінярскі**, **Павал Кур'яновіч**, **Кацярына Краснова**, **Маўлюда Атакулава**, **Кася Галіцкая**. Ля Цэнтральнага суду затрымалі сябраў «Моладзі БНФ» **Франака Вячорку**, **Антона Каліноўскага** і **Юрася Станкевіча**.

### Адзін з самых рэпрэсіўных у сьвеце

Паводле дакладу міжнароднай праваабарончай арганізацыі **Freedom House** «Свабода ў сьвеце», колькасьць «свабодных краін» склала ў 2007 г. 90 — гэта 47% дзяржаваў плянэты. Беларусь, Узбэкістан і Туркмэністан называюцца сярод найбольш «рэпрэсіўных» краін. Таксама адзначаецца ўціск палітычных свабодаў у Кітаі, Вэнэсуэле, Пакістане, Іране, Расеі.

### Карэну Акопаву далі 15 сутак

Цэнтральны суд Менску разгледзеў адміністратыўную справу актывіста незарэгістраванага «Руху «За Свабоду» **Карэна Акопава**. Яго звінавацілі ва ўдзеле ў мітынгу прадпрымальнікаў. Суд арыштаваў актывіста на 15 сутак. Нагадаем, К. Акопаў разам зь лідэрам рэспубліканскага аб'яднаньня прадпрымальнікаў «Пэрспэктыва» **Анатолем Шумчанкам** быў дэлегаваны ўдзельнікамі мітынгу 10 студзеня на перамовы ў Адміністрацыю прэзыдэнта.

### У Смургонях камунальнікі хадзілі зь бел-чырвона-белым сьцягам

Смургонскія актывісты «Моладзі БНФ» з нагоды Дня салідарнасьці з палітвязьнямі ўвечары 15 студзеня ўзьнялі на даху шматпавярховіка бел-чырвона-белы сьцяг. Ён правісеў да абеду наступнага дня. Супрацоўнікі ЖКГ зьнялі сьцяг, але, на дзіва, не парвалі й ня зьмялі яго, а распраўленым панесьлі праз двары й стадыён у невядомым кірунку. Акрамя сьцяга моладзь выставіла ў цэнтры гораду каля касьцёлу партрэты палітвязьняў ды зьніклых палітыкаў. Партрэты троху прастаялі, пасьля іх забралі супрацоўнікі міліцыі.

## 17 студзеня

### Фінькевіч ня згодны з прысудам

**Артур Фінькевіч** і ягоная новая адвакатка **Ганна Бахціна** вывучылі пратакол судовага працэсу, на якім актывісту далі 1,5 году зьняволеньня за парушэньне рэжыму адбыцьця «хіміі». Паводле Г. Бахціной, А. Фінькевіч знайшоў шэраг недакладнасьцяў, якія мае разгледзець суд. Г.Бахціна ўжо на наступным тыдні разьлічвае накіраваць канчатковую скаргу на вынесены прысуд. Калі скарга будзе разгледжаная, яна ня ведае. Адвакатка мяркуе, што Фінькевіч наўмысна не парушаў рэжыму адбыцьця «хіміі» і не заслугоўвае другога пакараньня.

Артура перавялі ў камэру, дзе знаходзіцца пяць чалавек. Усе, акрамя яго, кураць. Паводле словаў адвакаткі, пасьля прысуду Артур Фінькевіч тройчы зьвяртаўся да турэмных лекараў і прымаў таблеткі ад сэрца.

### Асудзілі за салідарнасьць

Напярэдадні абвешчанага на 21 студзеня мітынгу прадпрымальнікаў прайшлі суды над маладзевымі актывістамі, якіх масава затрымлівалі ў Менску 16 студзеня. Міліцыя працягвала хапаць людзей каля судоў. Колькасьць затрыманых дасягнула 41 чалавека.

На дадзены момант за кратамі на Акрэсьціна знаходзіцца 40 чалавек.

Судзьдзя суду Цэнтральнага раёну Менску **Тацяна Паўлючук** пакарала **Франака Вячорку** арыштам на 15 сутак. Столькі ж атрымалі **Уладзімер Сяргееў**, **Юрась Станкевіч**, **Кася Галіцкая**, **Кацярына Краснова. Антон Каліноўскі** быў асуджаны на 10 сутак. Судзьдзя **Аляксей Бычко** адмовіўся выклікаць сьведак з боку Красновай, якія маглі б паведаміць суду аб'ектыўную інфармацыю.

Побач з Цэнтральным судом затрымалі **Зьмітра Хведарука** і **Мікіту Шуцянкова**. Хведарука затрымлівалі з прымяненьнем грубай фізычнай сілы. На наступны дзень ён быў асуджаны на 15 сутак арышту.

Міліцыянт спрабавала перашкодзіць выкананьню сваіх абавязкаў фотажурналістцы «Нашай Нівы» **Юліі Дарашкевіч**, якая знаходзілася ў памяшканьні суду Цэнтральнага раёну Менску.

## 18 студзеня

### У Барысаве асуджаны прадпрымальнік

Яшчэ адзін актывіст кампаніі «За свабоднае разьвіцьцё прадпрымальніцтва» асуджаны на 15 сутак. Прадпрымальніка **Алега Лыску** абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным мітынгу грамадзян, які адбыўся 10 студзеня на плошчы перад будынкам Барысаўскага райвыканкаму. Прысуд вынесла судзьдзя **Вікторыя Юдзелевіч**.

### Мядзьведзеву аштрафавалі

Прадпрымальніца з Бабруйску **Алена Мядзьведзева** аштрафаваная на 30 базавых велічынь (1 млн 50 тыс. рублёў). Такое рашэньне вынес 18 студзеня суд Цэнтральнага раёну Менску. Яе абвінавацілі ў парушэньні парадку правядзеньня масавага мерапрыемства — удзел у акцыі пратэсту 10 студзеня. Нагадаем, што прадпрымальніцу затрымалі 17 студзеня ў Бабруйску. Затым супрацоўнікі міліцыі даставілі яе ў Цэнтральны РУУС Менску.

### Двух на трое сутак

Да трох сутак арышту асуджаны ў Горадні **Юры Істомін** і **Уладзімер Ларын** — лідэры мясцовай арганізацыі партыі АГП. Абодвум судзьдзя **Дзьмітры Мецяюк** інкрымінаваў арганізацыю несанкцыянаванага вулічнага мерапрыемства, якое нібыта мела месца яшчэ ў сьнежні 2007.

### На 20 сутак

Актывіст АГП **Віталь Стажараў** быў затрыманы за распаўсюд улётак з інфармацыяй пра мітынг прадпрымальнікаў 21 студзеня. Суд Цэнтральнага раёну сталіцы пакараў яго арыштам на 20 сутак.

### Пачаў галадоўку

Міліцыянты затрымалі актывіста прадпрымальніцкага руху **Анатоля Зьмітровіча** ў Сьветлагорску. Яго адвезьлі ў міліцыю і склалі пратакол за ўдзел у мітынгу прадпрымальнікаў 10 сьнежня. У знак пратэсту прадпрымальнік пачаў галадоўку. У панядзелак Зьмітровіча асудзілі на 5 сутак арышту.

## 19 студзеня

### Затрымалі ля Акрэсьціна

Супрацоўнікі міліцыі каля турмы на вул. Акрэсьціна затрымалі моладзевых актывістаў **Алега Корбана**, **Яўгена Бабровіча**, **Ягора Даброва**, **Ганну Ягораву**, **Аксану Крышчановіч**. Яны прыйшлі да спэцпрыёмніка сустрэць Вячаслава Сіўчыка. Усіх, апроч Алега Корбана, адпусьцілі. Алега ж у панядзелак асудзілі на 10 сутак.

### Пацярпела жонка Міхалевіча

Жонку намесьніка старшыні Партыі БНФ **Алеся Міхалевіча Мілану** на выхадзе з кватэры перанялі два міліцыянты і двое ў цывільным. Яны спрабавалі прайсьці разам зь ёй у кватэру і перадаць пазоў для Алеся. Яна адмовілася іх упусьціць і спрабавала дастаць тэлефон, пры гэтым адзін з прысутных шарпануў ёй руку. Мілану разам з 7-гадовай дачкой даставілі ў РУУС, але пасьля адпусьцілі.

## 21 студзеня

### Пазовы ў міліцыю

На 21 студзеня пазовы на допыты ў міліцыю атрымалі намесьнік старшыні АГП **Ігар Шынкарык**, намесьнікі старшыні Партыі БНФ **Віктар Івашкевіч** і **Алесь Міхалевіч**, **Леў Марголін** з Барысава. Пазовы зьявіцца ў міліцыю ў якасьці сьведак атрымалі таксама маладафронтаўцы **Алесь Круткін** і **Тацяна Буланава**.

### За распаўсюд прэсы

Пэнсіянэрка **Сьвятлана Данілава** аштрафаваная на 5 базавых велічыняў за распаўсюд незалежных выданьняў. Пэнсіянэрка з Барысава была затрыманая 20 студзеня ў пераходзе каля Камароўскага рынку за распаўсюд газэты «Народная воля». У сумцы ў яе міліцыянты знайшлі таксама нумары выданьняў «Товарищ», «Наш выбор», і некалькі асобнікаў «Свабоды Беларусі» і «Наш час».

## 22 студзеня

### За прадпрымальнікаў

У судах Цэнтральнага і Маскоўскага раёнаў Менску прайшлі суды над затрыманымі актывістамі і грамадзянамі падчас мітынгу прадпрымальнікаў 21 студзеня. **Саўчук Андрэй, Саўчук Тамара** — штраф 525 000 рублёў, **Бароўскі Вадзім, Грабянчук Аляксандар, Дземідзенка Мікалай, Любянчук Аляксандар, Сакалоўскі Валянцін, Балагура Канстанцін, Бугаеў Віктар** — штраф 700 000 рублёў, **Круткін Алесь, Гладкая Аліна, Субач Ліля** — 1 050 000 рублёў, **Бакур Юры, Субач Міхаіл** — штраф 1 400 000 рублёў, **Шарэнда Андрэй** — штраф 1 750 000 рублёў, **Бондар Аляксей** — 5 сутак арышту, **Прасьняк Андрэй** — 10 сутак арышту, **Пяцько Артур, Кукліш Віктар, Шаўцоў Сяргей, Уладзімер Няпомняшчы** — 15 сутак арышту, **Кім Андрэй** — 10 сутак арышту і 1 050 000 рублёў штрафу. Прысуды выносілі судзьдзі **Шылько Алена, Паўлючук Тацяна, Унукевіч Тамара, Самасейка Мікалай, Казак Віктар**.

**СП, ЗП**

# Ці патрэбна беларусу Сарбона?

Ці патрэбна беларусу Сарбона?.. Артыкул Ірыны Шаблоўскай з такой назвай зьявіўся на пачатку 1990-х і выклікаў шырокі рэзананс. Спадарыня Ірына даводзіла ў ім, што нацыя, пазбаўленая элітарнай адукацыі на роднай мове, не кіруецца ў бок нацыянальных інтарэсаў. Пісала пра пасярэдніцкую, але замяшчальную функцыю расейскай мовы пры вывучэньні твораў замежнай літаратуры, пра неабходнасьць беларускага перакладу сусьветнай клясыкі, пра небясьпеку як замежжацэнтрычнасьці, так і мястачковасьці нацыянальнай адукацыі.

**Ірына Шаблоўская** (1939—2004) першы ў Беларусі доктар філялягічных навук па замежнай літаратуры, прафэсар, на працягу больш як дваццаці год загадчык катэдры замежнай літаратуры Белдзяржунівэрсытэту, багеміст, перакладчык з чэскай мовы.



Задума кніжкі, у якую ўвайшоў згаданы артыкул, высьпела на пачатку 2001 г. «Ну хто, скажы, будзе шукаць якую газэту ці зборнік тэзісаў, каб прачытаць мой даклад ці артыкул? — усьміхалася спадарыня Ірына. — А тут табе ў адной кніжцы і рэцэпцыя, і ваенны раман, і драма абсурду і цэлая нізка артыкулаў па чэскай літаратуры». На працягу году акрэсьлівалася кампазыцыя з чатырох разьдзелаў: «Рэцэпцыя», «Тыпалёгія», «Кантакты», «Постаці», але праца над кнігай спынілася амаль на два гады, калі спадарыня Ірына паехала выкладаць славістыку ва ўнівэрсытэце Гранады ў Гішпаніі. Вярнуўшыся, аўтарка зноў узялася за справу. Яна сьпяшалася, бо ведала пра тое, пра што калегі пачалі здагадвацца значна пазьней. 25 сакавіка 2004 г. Ірыны Шаблоўскай ня стала. Яна сышла ціха, да апошняга моманту хаваючы сваю хваробу. Сышла, так і не пабачыўшы кніжкі, пра якую марыла.

У першым разьдзеле аналізуюцца і творы замежнай літаратуры, а таксама іх беларуская рэцэпцыя. Так, дасьледаваньне сэмантыкі шляхецкай сядзібы ў паэме Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш» нітуецца з разважаньнямі пра ролю культурнай прасторы ў жыцьці нацый. І найперш — сядзіб, засьценкаў, маёнткаў, замкаў, палацаў, паркаў. «Нельга абмінуць старыя ліпы, дубы, вербы, зарослыя сажалкі. Нават падсьвядома абуджаюць яны памяць продкаў. Яны — пункцір мінуўшчыны, азначэньне таго, што тут было і што неабходна вярнуць. Гэта — наш беларускі Парфэнон і наша беларуская Троя».

Практычна ў кожным артыкуле напаткаем адчуваньне асабістай далучанасьці аўтара да таго, што адбываецца ў сьвеце, да таго, з чаго пасьля складваецца Вялікая Гісторыя. У адным са выступленьняў, ня ўключаным у кнігу, аўтарка разважае аб праскім Скарыну — тэме вельмі дарагой для Ірыны Шаблоўскай: «...шлях да Скарыны яшчэ далёкі. Ад садкоў і школ павінны ведаць жыхары этнічных беларускіх земляў, хто такі Скарына. ...Калі кожны турыст, які прыедзе зь Беларусі ў Прагу, прыйдзе да помніка свайму суайчыньніку, пакладзе кветачку, тады адродзіцца Беларусь, яе культура. Гэта наша палітыка так званых «малых спраў», якую прапанаваў свайму народу першы чэскі прэзыдэнт Масарык». Мне вельмі б хацелася, каб гэтыя словы прачыталі тыя, па чыіх шматлікіх просьбах быў перайменаваны галоўны сталічны праспэкт.

Адметнае і супольнае ў нацыянальнай і замежных літаратурах дасьледуецца ў другім разьдзеле, які адкрывае артыкул, прысьвечаны фэномэну зямлі ў Фолкнэра і Коласа, своеасаблівасьці іхных мастацкіх унівэрсумаў. Некалькі матэрыялаў гэтага разьдзелу прысьвечаныя тыпалягічнаму вывучэньню ваеннай прозы (магістральнай тэме для ўсёй дасьледніцкай дзейнасьці аўтаркі), а таксама драме абсурду.

Разьдзел «Кантакты» цалкам зьнітаваны з чэскай літаратурай. Аўтарка захапляецца жыхарамі Прагі, што здолелі захаваць свой горад: «Па Празе я хаджу нямой ад захапленьня перад людзьмі, якія не разбурылі ніводнага старога слупа ці падмурка, нават калі ён замінаў бачыць рэнэсансныя формы, ніводнага дома, які бы нязграбным ён ні здаваўся, не зруйнавалі старыя могілкі. Я вырасла ў горадзе, ушчэнт разбураным у гады вайны, а потым на маіх вачах, ужо пасьля вайны, але ваеннымі сродкамі зрушылі вежы катэдры, дзе бралі шлюб мае бацькі, разбуралі старую Нямігу, па якой я на працягу дзесяці год хадзіла ў школу, дамы, дзе жылі мае школьныя сябры, дзе захоўвалася наасфэра старога Менску...»

Разглядаючы раман М. Кундэры «Нясьпешнасьць», Ірына Вікенцьеўна запрашае чытача нясьпешна прайсьціся па менскіх вулках. «Пакута чытаць «Нясьпешнасьць», — пагаджаецца яна зь нядбайнымі чытачамі,— калі нясуцца іншамаркі, цягнікі. Сьпяшаецца людзкі маналіт, асабліва небясьпечны ў гадзіны пік на буйных перакрыжаваньнях. Адштурхнуць, адціснуць, адсунуць і прабачэньня не папросяць... Няма калі... Хуткасьці ў канцы нашага стагодзьдзя — ці не галоўная яго прыкмета? Усяго за сто гадоў колькі чалавецтва займела, каб пераадолець Нясьпешнасьць... Адчуваю на сабе, як дзень скарачаецца няўмольна, а тут трэба бегчы ў бібліятэку чытаць «Нясьпешнасьць». Чытаць Ня Сьпешна».

Адарвемся і мы ад імклівай штодзённасьці і нясьпешна, старонка за старонкай будзем чытаць кнігу Ірыны Шаблоўскай. Слова за словам. Бо чалавек жыве сваім Словам. Гэта яе голас зь Вечнасьці. Ад Ірыны Шаблоўскай пачатак...

**Ганна Бутырчык**

**Сусветная літаратура ў беларускай прасторы: Рэцэпцыя. Тыпалогія. Кантакты.** — Менск: «Радыёла-Плюс», 2007


Руслан Аляхно.

# Дарашкевіч пра Аляхно

Фотарэпартаж з адборышча на «Эўрабачаньне»

На «Эўрабачаньне» сёлета паедзе Руслан Аляхно. Гэта стала вядома пасьля фіналу беларускага адбору «Эўрафэст».

У фінале ўзялі ўдзел апроч Аляхно, гурт «Litesound», Гюнэш, гурт «По глазам». Журы выбрала кандыдатуру пераможцы конкурсу «Народный артист-2004» Руслана Аляхно.

Конкурс «Эўрабачаньне-2008» пройдзе ў траўні ў Бялградзе (Сэрбія).

Летась Дзьмітры Калдун заняў на конкурсе шостае месца.

**Фота і тэкст Юліі Дарашкевіч**


Сьпявае фінскі гурт «Лордзі».


З гітарай — Ксенія Сітнік.






# Хадановіч выбраў Бэрлін,

## каб пачаць новую кнігу.

У сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва» выйшаў новы зборнік Андрэя Хадановіча «Бэрлібры». Гэта кніга вэрлібраў, якія аўтар нечакана для сябе — зьяўляючыся пасьлядоўным барацьбітом з гэтым жанрам у беларускай паэзіі — пачаў пісаць у Бэрліне ў 2004 г. Але ў кнізе ня толькі жарты.

Гэта самая сур'ёзная і шчырая кніга Хадановіча. Акрамя тэкстаў, якія аўтар, майстар шоў-выступаў, ахвотна і часта чытае з эстрады, ладны кавалак кнігі прызначаны для чытаньня вачыма і абдумваньня.

Кніга падзеленая на чатыры цыклі, кожны зь якіх адсылае чытача да вядомых фільмаў: «Касец газонаў», «Пераключаючы каналы», «Успомніць усё», «Апошняе мэтро» — любоўная лірыка, уражаньні ад вандровак, сьцёб з таталітарнай рэчаіснасьці і гульні з тэкстамі і сюжэтамі папярэднікаў, гульні аж да той мяжы, дзе «пачынаецца сьмерць і канчаецца літаратура».

Бэрлін, Амстэрдам, Кракаў, Браціслава, Менск — розныя гарады мільгацяць за вакном, выклікаючы самыя розныя эмоцыі і думкі. Кніга будзе цікавай ня толькі беларускім чытачам. Шмат якія тэксты зь яе перакладзеныя ўжо на іншыя мовы і існуюць у нямецкай, чэскай, славацкай, расейскай вэрсіях.

**ПК**

## АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

ПЛАКАЛІ, ЗНАЕМ!

Хлопчык трох гадоў
крочыць побач з маці,
а потым як зваліцца,
як трахнецца аб асфальт!
Каленка разьбітая ў кроў,
але ня плача,
трохгадовыя мужчыны ня плачуць,
падымаецца, атрасаецца
і незалежным тонам прамаўляе:
«Ледзь ня ўпаў!»

Хлопчык чатырох гадоў
ляжыць на апэрацыйным стале
і вось-вось заплача,
бо які ён ужо мужчына,
калі цёця доктар корпаецца
чымсьці жалезным яму ў пісі,
дзякуй, хоць бацькоў не пусьцілі.

Хлопчык пяці гадоў
дачакаўся смачнай перадачы
ў свой загарадны тубэркулёзны санаторый,
і на радасьцях зьеў яе ўсю,
вось толькі памыліўся шафаю,
а потым дзяўчынка нешта шукала ў ёй,
нічога не знайшла й заплакала,
і хлопчык зь ёй за кампанію,
бо хрэн зь імі, з апэльсінамі,
у санаторыі карантын,
і бацькоў зноў не пусьцілі,
вунь яны там, за акном,
махаюць яму рукамі,
покуль ён жарэ чужую перадачу…

Бацька трохмесячнай дачкі
па дарозе ў лазэрную клініку
падслухоўвае размову.

Хлопчык трох гадоў
крочыць побач з маці.
«Мама, а ведаеш, ты таксама памрэш!»
«Што ты такое вярзеш?!
Ты што, хочаш, каб твая мама памерла?»
«Не, я не хачу. Я проста нагадваю».

Госпадзе,
хай доктарка з лазэрнаю лінзаю не памыліцца,
беражы ў дарозе ўсіх Тваіх раьздзяўбаеў,
усіх сьляпых
і тых, каму сёньня закапалі вочы.

## «Бэрлібры» Андрэя Хадановіча

**7 лютага**

ў вялікай залі
Дома літаратара
(вул. Фрунзэ, 5)

**Пачатак а 19.00**

Андрэй Хадановіч запрашае на паэтычна-музычную акцыю **«Мэдыюм»**. У праграме прэзэнтацыя кнігі вершаў **«Бэрлібры»** і аўдыёкнігі **«Абменьнік»**. Удзельнічаюць гурты **INDIGA**, **BAND_A**, **Сяргей Пукст**, **Рацыянальная дыета**, **паэты Джэці (Вера Бурлак)**, **Дзьмітры Дзьмітрыеў**, **Максім Жбанкоў**, **Віктар Жыбуль**, **Марыйка Мартысевіч**, **Сяржук Мядзьведзеў**.
Уваход вольны.
Даведкі: 649-08-88.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



## ТЭАТРЫ

**Ідылія**

**4 лютага ў Купалаўскім тэатры** — «Ідылія», абноўленая рэжысэрам Міколам Пінігіным **да 200-годзьдзя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча**. **Пачатак а 19-й.** Квіткі па 6500—7000 руб. Замова квіткоў: (017) 284-15-31. Перад пачаткам — урачыстая частка з удзелам нашчадкаў Дуніна-Марцінкевіча: Станіслава Плаўскага, Тадэвуша Крыжаньскага, Бэаты-Хрысьціны Марцінкевіч (Польшча).

**Купалаўскі тэатар**

**25 (пт)** — «Таполевая завея»
**26 (сб)** — «Я не пакіну цябе»
**27 (ндз)** — «Каханьне ў стылі барока»
**28 (пн)** — «Маэстра»
**29 (аўт)** — «Больш чым дождж»
**30 (ср), 31 (чц)** — «Слуга двух гаспадароў»
**1 (пт)** — «Ромул Вялікі»
**2 (сб)** — «Чычыкаў»
**3 (ндз)** — «Дзіўная місіс Сэвідж»
*ранішія спэктаклі*
**27 (ндз)** — «Паўлінка»
**3 (ндз)** — «Афрыка»
*малая сцэна*
**25 (пт)** — «Апэльсінавае віно»
**26 (сб)** — «Саламея»
**28 (пн)** — «Адчыніце Кантралёру!»

**Тэатар беларускай драматургіі**

**25 (пт)** — «Сталіца Эраўнд»
**26 (сб)** — «Воўк-мараплавец»
**27 (ндз)** — «Нязваны госьць»
**29 (аўт)** — «П'емонцкі зьвер»
**30 (ср)** — «Сёстры Псыхеі»
**2 (сб)** — «Нязваны госьць»
**3 (ндз)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»

**Тэатар юнага гледача**

**25 (пт)** — «Мятылік»
**26 (сб), 27 (ндз)** — «Бармалей»
**26 (сб)** — «Апошняя дуэль»
**26 (сб)** — «Маленькі лорд Фаўнтлерой»
**27 (ндз)** — «Марныя намаганьні каханьня»
**27 (ндз)** — «Папялушка»
**29 (аўт)** — «Тая, што стварыла цуд»
**30 (ср)** — «Рыцар Ордэну Сонца»
**31 (чц)** — «А сьвітанкі тут ціхія»

## ІМПРЭЗЫ

**Песьні залатой Крывіі**

Пад такім назовам **2 лютага ў Чырвоным касьцёле** адбудзецца **вечарына-прэзэнтацыя аднайменнага кампакт-дыска** паэта-барда **Эдуарда Акуліна**. У імпрэзе бяруць удзел: Ніл Гілевіч, Вольга Іпатава, Леанід Дранько-Майсюк, Алесь Камоцкі, Кастусь Герашчанка, Анатоль Мяльгуй, Віталь Супрановіч. Ласкава запрашаем усіх прыхільнікаў беларускай паэзіі і песьні. **Пачатак а 18 гадзіне.** Уваход вольны. Т.: (029)649-08-88

**Аўтары і героі**

**3 лютага ў тэатральнай залі Чырвонага касьцёла** пройдзе **сустрэча з аўтарамі і героямі кнігі «222 альбома беларускага року і ня толькі»**. Удзельнічаюць: Вітаўт Мартыненка, Анатоль Мяльгуй, Лявон Вольскі (N.R.M.), Алег Хаменка («Палац»), Андрэй Пляснаў ( P.L.A.N.), Яраш Малішэўскі (Pete Paff), Зьміцер Бартосік ды інш. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны. Т.: (029)649-08-88

## ФЭСТЫВАЛЬ

**Энэргія сальсы**

**25—27 студзеня** ў Менску ўпершыню пройдзе фэстываль лацінаамэрыканскай культуры «Энэргія сальсы». Чакаюцца майстар-клясы лацінаамэрыканскіх танцаў, жывая музыка, яркія кубінскія касьцюмы. Фэстываль адбудзецца **ў Вялікай танцавальнай залі БНТУ (вул. Якуба Коласа, 12)**. Т.: (029) 504-33-68, (029) 158-87-88.

## ВЫСТАВЫ

**Філятэлістычная Шагаліяна**

**Да 10 лютага ў Музэі гісторыі і культуры** працуе выстава **«Штрыхі біяграфіі і творчасьці»**, прысьвечаная Шагалу. У экспазыцыі прсдатўленыя ня працы мастака, а іх выявы і копіі — на марках, капэртах і паштоўках. Каля 200 экспанатаў выставы — з асабістай калекцыі прыхільніка Шагала амэрыканца Гары Ізраітэля.

**Вобразы эпохі**

**У Мастацкім музэі да 4 лютага** працуе **выстава твораў Яўгенія Зайцава** «Вобразы эпохі».

**Жодзінцы**

**6 лютага а 18-й у менскім Палацы мастацтваў (вул. Казлова, 3)** адбудзецца **літаратурна-мастацкая імпрэза і адкрыцьцё выставы «Жодзінцы»**. Удзел возьмуць Аляксей Марачкін, Уладзімер Сіўчыкаў, Аляксандар Ксяндзоў, Валеры Славук, Алесь Аркуш, Мікола Андруковіч, Уладзімер Гладкевіч, Віктар Зайцаў, Мікола Крайко, Аляксандар Фралянкоў, Мікола Шышлоў, Ігар Марачкін і іншыя. Выставу, якая экспанавалася ў Жодзіне, Полацку, Наваполацку і рэпрэзэнтавала 20 мастакоў, мяркуецца паказаць яшчэ ў Горках і ў Лагойску.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Монстра»

**Монстра** (Cloverfield)

ЗША, 2008, **каляровы**, 84 хв.

**Рэжысэр:** Мэт Рыўз

**Жанр:** Фільм-катастрофа, жахі

**Адзнака:** 7,5 (з 10)

Калі сябры ладзяць разьвітальную вечарыну з Робам, які сабраўся ў Японію, на Мангэтэн абрынаецца катастрофа. Захапіўшы відэакамэру, «бо людзям будзе цікава даведвацца, што адбываецца», героі адпраўляюцца ратаваць сяброўку Роба...

Карціна «Монстра» — гэта «Гадзіла», зьнятая на аматарскую камэру пад хроніку 11 верасьня. Суб'ектыўная камэра для страшных фільмаў выкарыстоўвалася ў 1970-я Руджэрам Дэадата і ў 1990-я ў папулярным фільме «Ведзьма з Блэр». Зь неахайнымі здымкамі экспэрымэнтавалі дацкія «Дагматыкі».

Але стваральнікі «Монстры» давялі прыёмы аматарскай камэры да нечуванае дасканаласьці. У фільме-катастрофе ў ідэальнай прапорцыі прысутнічаюць усе элемэнты.

Ёсьць просты й эфэктыўны сюжэт з кананічнай атакай пачвараў на вялікі горад. Ёсьць цельпукаватыя героі, якім спачуваеш; і тое, што ролі граюць незнакамітыя акторы — вялікі плюс. І ёсьць тое, што заўжды ведалі знаўцы кіно: палохаюць намёкі, зьбялелыя ад страху твары, зьнямеласьць і чалавечы крык.

Абяцаныя монстры ў фільме зьяўляцца, але ў неабходнай мінімальнай дозе (хаця стужка бязь іх была б зусім геніяльнай). Усе неабходныя жанравыя павароты зьдзейсьняцца. Але ператвораны ў жэле глядач — будзе ўпэўнены, што ўсё праўда. Што мы бачылі катастрофу на ўласныя вочы. Што самі падымаліся на хмарачос. І змагаліся са злом да апошняга.

Рэжысэры Мэт Рыўз і Джэй Абрамз загадзя падкупілі гледача чуткамі, рэклямнымі ролікамі, якія выглядалі, як хроніка — і вірусным сецевым маркетынгам, калі самі заўзятары загадзя прыдумлялі карціну.

Фільм варта глядзець толькі на вялікім экране з аб'ёмным гукам.

**Андрэй Расінскі**

## КАЛІ Б...

**...абвінавачаньне супраць Міхалевіча на старонках «СБ», што той, быццам, за ўсё жыцьцё не сабраў нават вядра бульбы, было пачаткам вялікай прапагандысцкай кампаніі па дыскрэдытацыі апазыцыі.**



МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

**Дачнік:** Калі ласка, рыдлёўку. Пара ужо бульбу садзіць.

**Прадаўшчыца:** Рыдлёўку захацеў? Вось, чытай Указ: вёдры, рыдлёўкі і сродкі супраць жукоў прадаваць толькі за подпісам начальніка аддзелу ідэалёгіі пры выканкаму.

# Хадановіч выбраў Бэрлін

Старонка 30.



## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Мікалаю Ш. з Салігорску.** Як паведамілі нам у выдавецтве «Тэхналёгія», наступны том «Слоўніка мовы «Нашай Нівы» выйдзе сёлета.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Партыя народнай свабоды (к.–д.) дамагалася зьмяніць закон аб бюджэце (росьпісі расходаў і даходаў казны). Дэпутат Шынгароў (к.–д.) кажа, што па цяперашнім законе Дума ня можа праверыць, як правіцельства выдае народныя грошы.

**«Наша Ніва». № 3. 1908**





# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Марцін** — любае наша медзьведзянятка! Віншуем цябе з 10 Днём народзінаў, працягвай радаваць нас! Тата і мама

**Альцечка-сонейка!** Дзякуй табе за Марціка!

**21 студзеня** Дзень народзінаў у Паўла Батуева (1982 г.н.), нашага калегі і баявога сябра з Салігорску. Павіншуем Паўла!!!

### КВАТЭРА

**Здаецца** аднапакаёвая кватэра ў раёне Ўручча прыстойнымі беларускамоўнымі гаспадарамі. Т.: (029) 630–63–26. Валодзя

**Маладая беларускамоўная сям'я** зь дзіцём 6 гадоў здыме адносна таннае прыстойнае жытло ў Менску альбо пад Менскам (каб часта хадзілі электрычка ці аўтобус). Разглядаюцца ЎСЕ варыянты. Т.:(029) 198–32–51

**Прадам** за 53 т. цагляны дом плошчай 100 кв.м. (зроблены на 70%) з участкам (6 сотак), побач зь менскай кальцавой. Ёсьць электрычнасьць, вада , падводзіцца газ. Т. (029) 576–74–29

### ВАШ РОД

**Дапаможам** праверыць шляхетнасьць Вашага роду. Дашліце Вашае прозьвішча. alesknigi@mail.ru

### КНІГІ

**Прапаную кнігі** з сэрыі «Кнігарня «Нашай Нівы», «Беларускі кнігазбор» (у тым ліку Мальдзіс), кнігі па генэалёгіі (многа), часопісы ARCHE, «Фрагмэнты», творы маладых аўтараў, многа іншага, дашлю сьпіс прапанаваў. Т.: (029) 753–91–96. alesknigi@mail.ru

**Прапаную кнігі**: Ластоўскі «Расейска-крыўскі (беларускі) слоўнік» 1924 г., «Тэўтонскі ордэн», «Наша Ніва» 1906—1908 гг.», «Наша Доля» 1905 г.», Тарашкевіч «Граматыка беларускай мовы» 1929 г., «Беларускі кнігазбор»: Летапісы і хронікі, Геніюш, Баршчэўскі, Чачот ды інш., багаты выбар. Т.: (029) 753–70–05

### СПАЧУВАНЬНІ

**Глыбока спачуваем** спадарыні Тамары Мацкевіч у яе вялікім горы — сьмерці бацькі. nastaunik.info, Цэнтар «Супольнасьць», калегі-настаўнікі, сябры

**Спачуваньні** праз сайт выказалі Юрась Зянковіч, Тэльман Масьлюкоў, Васіль Мацкевіч, Сяржук Салаш, Андрэй Церашкоў, Зьміцер Вінаградаў, Алёна Андрэева, Алесь Капуцкі, Алесь і Натальля, Алесь Стральцоў-Карвацкі, Сяржук Бахун, Мікалай Тоўсьцік.

**Тамара Мацкевіч** адказала: Дзякуй вялікі, мае дарагія! Трымаюся і маму трымаю. Толькі шкадую, што ня ўсіх сваіх сяброў пасьпела пазнаёміць з бацькам — сапраўдным Беларусам.

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем у падарожжа** 27 студзеня (нядзеля): Дуды—Іўе—Суботнікі—Ліпнішкі—Жамыславы—Геранёны—Лаздуны—Трабы. 1—4 лютага: Катынь—Смаленск і ваколіцы. Т.: (029) 292–54–58, (029) 622–57–20, (029) 509–12–16, (029) 110–19–28


**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
заснавальнік Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**.



Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 23.01.2008.

Замова № 414.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.